Дзяржаўная ўстанова адукацыі
"Сяражская сярэдняя школа"

# Летапіс школы



Змест

1. Гісторыі развіцця дзяржаўнай установы адукацыі ”Сяражская сярэдняя школа“......................................................................................3

2. Кіраўнікі дзяржаўнай установы адукацыі ”Сяражская сярэдняя школа“.......................................................................................................5

3. ”Яны вучыліся ў нашай школе“ (ветэраны працы).................................8

4. ”Слова пра Настаўнікаў“ (ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны педагагічнай працы) ..............................................................9

5. ”Знакамітыя выпускнікі“ Сяражскай сярэдняй школы .......................26

6. ”Яны закончылі Сяражскую сярэднюю школу з залатым і сярэбраным медалём“ ......................................................................................36

6. Дасягненні Сяражскай сярэдняй школы ...............................................38



## 1. Гісторыі развіцця дзяржаўнай установы адукацыі ”Сяражская сярэдняя школа“

У 1886 годзе ў вёсцы Сярагі (”Серож“ – у адпаведнасці з ”Русскими ведомостями“) было 76 двароў і 170 жыхароў. Да 1913 года ў вусцы сярагі школы не было.дзеці вучыліся па хатах (гаспадарчых дварах). Вучылі дзяцей народныя настаўнікі з адукацыяй 5-6 класаў, якую яны атрымлівалі ў Лучнікоўскім вучылішчы. Заробак настаўніка: 1 пуд збожжа ў месяц; 1 руб. у год ад кожнага вучня. У гэты час вучылі дзяцей наступныя настаўнікі:

– Басалыга Іван Сямёнавіч;
– Басалыга Дзмітрый Яфімавіч;
– Басалыга Іван Яфімавіч;
– Грыцкевіч Пётр Васільевіч (будучы першы старшыня Сяражскага сельскага савета).

Усе дзеці і нават настаўнікі хадзілі ў лапцях, мала ў каго былі боты.

Навучанне было вельмі строгім. Дзеці навучаліся матэматыцы, тлумачальнаму чытанню, пісьму. Але першым урокам заўсёды быў закон божы.

У 1912 годзе ў пасёлку Качалава было народнае вучылішча, дзе працавала Аўсянік Вера. Некаторыя жыхары вёскі сярагі вучыліся там. Аб гэтым сведчыць пасведчанне на імя Славашэвіча М.С., якое захоўвалася раней у вясковым музеі. Вучылішча праіснавала да 1917 года.

У 1913 годзе грамадзянін вёскі Сярагі Сцепановіч Цімафей Пятровіч, які меў 10 дзяцей (9 сыноў, адну дачку), узяў крэдыт і пабудаваў на сваёй сядзібе драўлянае памяшканне, якое мела 3 пакоі (кухня, кватэра для настаўніка і вялікі зал – клас). Школа была чатырохкласнай (I – IV класы).

У 1933 годзе за вёскай, каля могілак, сяляне вёскі Сярагі на добраахвотных пачатках, усёй вясковай грамадою пабудавалі будынак для школы. Прычым, большая частка гэтага будынка была зроблена з будынка невялікай царквы, што знаходзілася на сяражскіх могілках.



Працавала чатыры класы – Сяражская пачатковая школа. Першыя настаўнікі:

- Бабарэніна Валянціна Сямёнаўна;
- Сцепановіч Пётр Цімафеевіч;
- Івановіч Іван Іванавіч;
- Понтус Марыя Іванаўна.

Пазней школа была ператворана ў сямігадовую. Першым дырэктарам Сяражскай ПШ быў Ілюкевіч Антон Філіпавіч. У студзені 1935 года быў прызначаны новы дырэктар – Кавалёў Рыгор Дзянісавіч, якога расстралялі фашысты ў жніўні 1942 года…

У 1937/1938 навучальным годзе ў Сяражскай ПШ было было 60 камсамольцаў і больш за 100 піянераў.

У час Вялікай Айчыннай вайны па загаду нямецкіх улад ў школе некаторы час праводзіліся заняткі, і многія жыхары вучыліся пры нямецкай акупацыі.

Пасля вызвалення Беларусі з 1 верасня 1944 года пачаліся рэгулярныя заняткі (будынак школы захаваўся), хаця ў гэты час на Захадзе яшчэ ішлі ўпартыя баі савецкіх войск з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Дырэктарам школы быў прызначаны партызан Каспяровіч Н.І. У школе тады вучыліся вучні з першага па сёмы класы. Многія з іх у час вайны не вучыліся, і цяпер ім прыходзілася наганяць упушчанае. Так, у 1 класе вучыліся 11-гадовыя, а ў 7 класе 17-гадовыя юнакі і дзяўчаты.



## 2. Кіраўнікі дзяржаўнай установы адукацыі ”Сяражская сярэдняя школа“

Першым дырэктарам Сяражскай пачатковай школы быў Ілюкевіч Антон Філіпавіч.

У студзені 1935 года быў прызначаны новы дырэктар – Кавалёў Рыгор Дзянісавіч.




З 1 верасня 1944 года дырэктарам школы быў прызначаны партызан Каспяровіч Н.І. У 1949 годзе дырэктарам школы стаў Сіліванчык Павел Паўлавіч. Па яго ініцыятыве ў 1954 годзе сямігадовая школа была ператворана ў ”Сяражскую сярэднюю школу“.

З 1963 года Новік Аляксей Андрэевіч пачынае працаваць дырэктарам Сяражскай сярэдняй школы, ветэран ВАВ. Скончыў гістарычны факультэт педагагічнага інстытута, працаваў дырэктарам у Васілінках, Паўстыні, з 1963 па 1980 дырэктар Сяражскай сярэдняй школы. Нарадзіўся Аляксей Андрэевіч у вёсцы Іграева Слуцкага павета ў сялянскай сям'і. З 1940 года Аляксей Андрэевіч пасля заканчэння Слуцкага педвучылішча выкладаў гісторыю і рускую мову пад Беластокам, у Заходняй Беларусі. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў ліку бежанцаў пешшу вярнуўся на Случчыну. З 1942 года – у партызанскім атрадзе імя 14 Слуцкіх партызан. Удзельнік вызвалення Слуцка. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі ”Партызану Вялікай Айчыннай вайны“, ”За перамогу над Германіяй“, медалём Маршала Жукава. У 1981 годзе выйшаў на пенсію, але працаваў настаўнікам Сяражская СШ да 1991 года. Новік А.А. успамінае: ”У жніўні 1963 года загадам па Мінскаму аблвыканкаму я быў прызначаны дырэктарам школы і на гэтай пасадзе працаваў да верасня 1980 года. Будынак школы знаходзіўся каля могілак у двух драўляных дамах, у якіх было 8 класных пакояў, пакой для настаўнікаў, невялікі зал – калідор (для заняткаў па фізічнай культуры), пакой для школьнай сталярнай майстэрні і невялікі пакой, у якім знаходзілася бібліятэка школы. Заняткі праводзіліся ў дзве змены. Школу наведвалі не толькі вучні з вёскі Сярагі, але і з вёсак Варкавічы, Ушалавічы, Бранава і Паўлаўка. У 1963 годзе ў школе налічвалася 405 вучняў. Усе класы з 5 па 10 складаліся з



двух груп (”А“ і ”Б“). Пакольki жыхары жылі бедна, то дрэнна харчавалася і бедна апраналася большасць вучняў. Звычайна ў цёплае надвор’е дзеці прыходзілі ў школу на босцю нагу, і настаўнікі ”змагаліся“ за тое, каб у іх былі памытыя ногі. Алё жыццё з кожным годам паляпшаася. У 1951 годзе ў вёсцы Сярагі з’явілася электраасвятленне.“



З 1980 года па 1983 год дырэктарам Сяражская сярэдняй школы працаваў Жываглод Яўген Фёдаравіч. Жываглод Я.Ф. нарадзіўся ў вёсцы Казловічы Слуцкага раёна. У Казловічах скончыў сярэднюю школу. Пасля арміі паступіў ў Мінскі універсітэт на філалагічны факультэт. У 1978 годзе прыехаў разам з сям’ёю ў вёску Сярагі. Спачатку працаваў намеснікам дырэктара школы, а з 1980 года па 1983 год быў дырэктарам Сяражскай сярэдняй школы.

Міронава Ірына Анатольеўна пасля заканчэння школы паступіла ў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут. У 1979 годзе паехала працаваць настаўнікам матэматыкі ў Сяражскую сярэднюю школу. У 1980 годзе яе прызначылі намеснікам дарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце. З 1983 года па 1991 год працавала дырэктарам Сяражскай сярэдняй школы.





Яблонская Валянціна Сяргееўна нарадзілася ў вёсцы Мікашэвічы лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці.там жа і а рымала першапачатковую адукацыю. Адразу пасля школы працавала ў дзіцячым садзе выхавацелем. У 1970 годзе паступіла ў Брэсцкі педагагічны інстытут на фізіка-матэматычны факультэт на адзяленне матэматыкі. Закончыла ў 1975 годзе. Пасля заканчэння працавала па напраўленню ў вёсцы Чырвоная Воля Лінінецкага раёна. Пасля 1 год працавала ў вёсцы Гацук загадчыкам дзіцячага сада. У 1991 годзе з сям’ёй пераехала ў вёску Сярагі, дзе працавала дырэктарам Сяражскай сярэдняй школы. З 1991 па 2003 год.

З 2003 года дырэктарам Сяражскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы становіцца Дварэцкая Марыя Міхайлаўна.



Нарадзілася Дварэцкая М.М. у вёсцы Сярагі. Закончыла Сяражскую сярэднюю школу. У 1982 годзе скончыла ТУ-44 бытавога абслугоўвання насельніцтва г.Магілёва па спецыяльнасці ”Закройшчык жаночага і дзіцячага лёгкага плацця“, працавала доўгі час настаўнікам працоўнага навучання. Пасля заканчэння ў 1999 годзе (завочна) БДПУ па спецыяльнасці ”Геаграфія“, працавала ў школе настаўнікам геаграфіі.

З 2010 года дырэктарам дзяржаўнай установы адукацыі становіцца Касцюкевіч Святлана Мікалаеўна, якая працуе на гэтай пасадзе па сёняшнім дзень (2022 год).



Касцюкевіч Святлана Мікалаеўна скончыла ў 1984 годзе сярэднюю школу №5 г. Слуцка. У 1989 годзе скончыла Мінскі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя А.М.Горкага па спецыяльнасці ”Матэматыка“. Пачала працаваць настаўнікам матэматыкі і інфарматыкі ў Сяражскай сярэдняй агульнаадукацыйнай школе з 1998 года. З 2003 па 2010 год працавала намеснікам дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце ў Сяражскай сярэдняй школе.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі ”Сяражская сярэдняя школа“ прызнана пераможцам раённага конкурсу сярод устаноў адукацыі Слуцкага раёна ”За высокія паказчыкі ў развіцці адукацыі“ па выніках 2021 года ў намінацыі ”Лепшая ўстанова агульнай сярэдняй адукацыі, якая размешчана ў сельскай мясцовасці“ (загад упраўлення па адукацыі Слуцкага райвыканкама ад 23.12.2021 № 642).

## 3. ”Яны вучыліся ў нашай школе“ (ветэраны працы)



Шклярэўскі Сяргей Іванавіч (1928 – 1921) – герой сацыялістычнай працы. Загадчык фельдчарскім пунктам у в. Покрышава.



Шахновіч Васіль Васільевіч (1922 – 1983) – генерал-лейтэнант савецкай арміі, ветэран Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны – камандуючы арміяй, ваенны аташэ ў Самалі.

Чуйка Мікалай Макаравіч (1900 – 1983) – герой сацыялістычнай працы, акадэмік АН УССР. Прафесар Днепрапятроўскага металургічнага інстытута.



## 4. ”Слова пра Настаўнікаў“ (ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны педагагічнай працы)

Героі дадзенага ”Слова“ – ветэраны Вялікай Айчыннай вайны, ветэраны працы, настаўнікі, аддаўшыя школе па 40 гадоў жыцця, людзі вельмі падобнага лёсу – Іван Паўлавіч Янучок, Міхаіл Фёдаравіч Янковіч, Новік Аляксей Андрэевіч.



**Іван Паўлавіч Янучок**
**(1923 – 2013)**

Чым я раны твае супакою?
Чым я боль ад цябе праганю?
Франтавою дарогай сляпою
Ты ідзеш напярэймы агню...
Гром і роспач ліхой навальніцы,
Глуха стогне святая зямля,
Снег крывавы палае, іскрыцца,
Хмара чорная наплыла.
Меціць зноў да цябе прытуліцца
Недарэчная смерць-сатана...
Ну, калі перастане сніцца
Гэта жудасная вайна?!

Таіса Трафімава (Янучок)

Гэтыя кранаючыя радкі верша адносяцца да Івана Паўлавіча Янучка, настаўніка Сяражскай сярэдняй школы Слуцкага раёна, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны. Прысвяціла гэтыя цудоўныя вершы свайму бацьку яго дачка, паэтка, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, Таіса Трафімава.

Нарадзіўся Іван Паўлавіч у далёкім 1923 годзе, 21 чэрвеня, у вёсцы Сярагі. Хатка была старэнькая, таму бацькі купілі недзе зруб, перавезлі яго і заснавалі хутар паміж Сярагамі і Падліпцамі. Недалёка знаходзіўся пасёлак Манькова, у якім налічвалася дзесяць гаспадарак.

Юнак цягнуўся да ведаў. У 1939 годзе скончыў 7 класаў Сяражскай сярэдняй школы. Вучоба давалася лёгка. Бо было да яе жаданне. Марыў стаць настаўнікам. І да гэтага часу Іван Паўлавіч ўдзячны свайму сябру з Падліпцаў, ветэрану вайны Міхаілу Фёдаравічу Янковічу за параду паступіць у педвучылішча. Пасля сямігодкі закончыў два курсы Слуцкага педвучылішча, збіраўся ў інстытут. Мары перакрэсліла вайна. Іван Паўлавіч быў яшчэ недаростак, і ў рады Чырвонай Арміі не мабілізоўвалі. Таму і застаўся з маці і малодшым братам на акупіраванай фашыстамі тэрыторыі, у Манькове. Працаваў у сельскай гаспадарцы.

Пасля вызвалення Случчыны ад акупацыі ў пачатку ліпеня сорак чацвёртага года ў рады Чырвонай Арміі прызвалі і Івана Паўлавіча.

Ваяваў на 3-ім Беларускім фронце, якім камандаваў І.Д. Чарняхоўскі, у 50-й дывізіі, 52-ім палку. Пайшоў на перадавую са 197 армейскага запаснога стралковага палка. Мелі напрамак на вызваленне Варшавы. Не дайшоўшы да Варшавы 25 кіламетраў, 28-ю армію накіравалі ва Усходнюю Прусію. Прыйшлося ўступіць у схватку з фашыстамі. Тут яшчэ раз Іван Паўлавіч убачыў, як разбіваюцца нямецкія танкі аб непахісную мужнасць савецкіх салдат. З баямі бралі гарады Інсценбург (Чарняхоўск), Велау, Дамнау, Гумбінен.

У хвіліны цішыні Іван Паўлавіч вёў франтавы дзённік, пісаў вершы, слаў дамоў вестачкі. Салдацкі трохкутнік... У кожным - дыханне тых гераічных дзён і начэй, калі кавалася наша Перамога.

21 студзеня 1945 года ў баі за горад Гумбінен Івана Паўлавіча параніла. Куля навылёт прабіла пераносіцу і выйшла праз правую шчаку. Ён страціў шмат крыві, страціў прытомнасць. Знясіленага, яго эвакуіравалі ў шпіталь г. Каунаса ў вочнае аддзяленне.

Аб чым думае чалавек, трапіўшы ў бяду? Аб пражытым жыцці? Аб будучым? Іван Паўлавіч моўчкі ляжаў з перабінтаванымі галавой і тварам і думаў аб тым, што яшчэ не поўнасцю адпомсціў гітлераўцам за тыя злачынствы, якія яны тварылі на нашай зямлі. Ён шукаў ніці, якія б маглі злучыць яго з жыццём не як інваліда, а як змагара за мірнае, шчаслівае жыццё, як прафесійнага настаўніка. Перад вачыма паўставалі маці, маладая жонка, маленькая дачушка. Вось яна, рэчка Лакнея, праз якую праводзілі яго на фронт Анюта з Леначкай. У хвіліны развітання Іван Паўлавіч перадаў дачку ў рукі жонкі Анюты. Запомніліся яе вочы: вялікія, поўныя страху, разумення, роспачы. Прыпасці б цяпер да яе роднага мілага твару! “Але наогул, ці буду я бачыць?”—з трывогай думаў малады салдат. Тугая павязка рабіла балючым кожны рух.

Медыкі дзівіліся, што ён застаўся жыць, нават не згубіў зрок. Здарыўся гэты цуд, мабыць, па малітвах яго маці, якая дома, у пасёлку Манькова Слуцкага раёна, чакала вяртання свайго сыночка дадому.

Цяпер, слухаючы ўспаміны Івана Паўлавіча пра тыя цяжкія дні, чамусьці прыгадваецца Аляксей Мярэсьеў. Вось так, як гэты герой, прыкаваны да ложка, ляжаў Іван Паўлавіч, малады, прыгожы, таленавіты, прагны да жыцця, рызыкуючы назаўсёды страціць зрок. Яму прыходзілі пісьмы ад сяброў з фронту. Па яго просьбе пісьмы адпісвалі параненыя байцы. Іван Паўлавіч дыктаваў: “Я вярнуся на фронт. У мяне яшчэ не закончана расплата з ворагамі маёй Радзімы!” У гэтым пісьме — увесь Іван Паўлавіч. Яго характар, характар сапраўднага савецкага чалавека.

Амаль чатыры месяцы праляжаў у шпіталі. “Прайшлі гады, — успамінае Іван Паўлавіч, -- але не забываюцца ўмелыя рукі хірургаў. Асабліва помніцца загадчыца вочнага аддзялення Лілія Лазараўна - вялікай душы чалавек, якая старалася як магла вярнуць зрок.”

Лёс загадаў Івану Паўлавічу зноў вярнуцца на фронт у 202-і запасны полк у гор. Алінштэйн. Ваяваў у складзе 11-й гвардзейскай арміі ў 5 дывізіі. Малодшы сяржант, камандзір кулямётнага аддзялення. Усім падабаўся выдатны почарк Івана Паўлавіча. Ён выконваў абавязкі ротнага пісара, быў камсоргам роты.

Праз некаторы час армія пападае зноў на перадавую. Мужна помсцяць байцы за спаленыя гарады і вёскі, за здзекі з мірных людзей. Бяруць гарады Кенігсберг (Калінінград), Пілау (Балтыйск).

Пераправіўшыся на лодках, 6 дзён наступалі на Куршскай касе (паўостраў, які ўразаецца ў Балтыйскае мора). Пасля баёў часць распалажылася ў г. Тапіау на кароткі адпачынак, дзе і сустрэлі доўгачаканы Дзень Перамогі. Тут упершыню адчулі ап’яняючы дотык міру і першыя хвіліны асаблівай, ласкавай цішыні, адчулі, што на свеце вясна, май, час цвіцення. “Дома, напэўна, зацвілі сады”, — з замілаваннем у сэрцы падумаў Іван Паўлавіч. Кветкі таго пераможнага мая засталіся самымі яркімі ў яго жыцці.

Іван Паўлавіч прайшоў усю Усходнюю Прусію. Ён ваяваў у неймаверных выпрабаваннях. Аб стойкасці і мужнасці яго сведчаць баявыя ўзнагароды, што зіхацяць на яго грудзях: “Медаль за отвагу”, “За взятне Кнннгсберга”, “За Победу над Германней”. У 1945 годзе атрымаў значок “Выдатны кулямётчык” - за ўдзел у баях ва Усходняй Прусіі. А ў мірныя гады да іх далучыліся юбілейныя медалі.

Службу Іван Паўлавіч працягваў і ў мірныя дні і дэмабілізаваўся ў 1947 годзе. Ён вярнуўся ў сваю сям’ю. То была радасная гадзіна і вельмі горкая. Ён даведаўся, што не вярнулася ў сяло шмат аднавяскоўцаў.


„ЗА ВЗЯТИЕ КЕНИГСБЕРГА“

10 АПРЕЛЯ 1945 г.

А № 103348

УДОСТОВЕРЕНИЕ

ЗА УЧАСТИЕ В ГЕРОИЧЕСКОМ ШТУРМЕ И ВЗЯТИИ КЕНИГСБЕРГА

Гвардии мл. сержант

Янугок

Иван Павлович

УКАЗОМ ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР от 9 июня 1945 года НАГРАЖДЕН МЕДАЛЬЮ

„ЗА ВЗЯТИЕ КЕНИГСБЕРГА“

От имени ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР МЕДАЛЬ ВРУЧЕНА


„ЗА ПОБЕДУ НАД ГЕРМАНИЕЙ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ 1941—1945 гг.“

УДОСТОВЕРЕНИЕ

ЗА УЧАСТИЕ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ

Гвардии мл. сержант

Янучек

Иван Павлович

УКАЗОМ ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР от 9 мая 1945 года НАГРАЖДЕН МЕДАЛЬЮ

„ЗА ПОБЕДУ НАД ГЕРМАНИЕЙ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ 1941—1945 гг.“

От имени ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР МЕДАЛЬ ВРУЧЕНА

1945 г.



СОЮЗ СОВЕТСКИХ СОЦИАЛИСТИЧЕСКИХ РЕСПУБЛИК

УДОСТОВЕРЕНИЕ К МЕДАЛИ „ВЕТЕРАН ТРУДА“



УДОСТОВЕРЕНИЕ

Янучок
Иван
Павлович

НАГРАЖДЕН (А) ЮБИЛЕЙНОЙ МЕДАЛЬЮ

"60 ЛЕТ ПОБЕДЫ В ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЕ 1941 - 1945 гг."

... Президента Республики Беларусь ...

... 2005 года



УДОСТОВЕРЕНИЕ

Янучек
Иван
Павлович

за долголетний добросовестный труд от имени Президиума Верховного Совета СССР решением исполкома Минского областного Совета народных депутатов от 26 сентября 1983 г. награжден медалью «ВЕТЕРАН ТРУДА»

... Минского областного ...

... октября 1985 г.



«50 ЛЕТ ВООРУЖЕННЫХ СИЛ СССР»

УДОСТОВЕРЕНИЕ

Янучок
Иван
Павлович

В СООТВЕТСТВИИ С УКАЗОМ ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР ОТ 26 ДЕКАБРЯ 1967 ГОДА НАГРАЖДЕН ЮБИЛЕЙНОЙ МЕДАЛЬЮ «50 ЛЕТ ВООРУЖЕННЫХ СИЛ СССР»

ОТ ИМЕНИ ПРЕЗИДИУМА ВЕРХОВНОГО СОВЕТА СССР МЕДАЛЬ ВРУЧЕНА

18 ... года.

М. П. ... военком



40

УВАЖАЕМЫЙ ТОВ. Янучок Иван Павлович

Приказом МО СССР от 6 апреля 1985 года № 75 за храбрость, стойкость и мужество, проявленные в борьбе с немецко-фашистскими захватчиками и в ознаменование 40-летия Победы советского народа в Великой Отечественной войне 1941—45 гг. Вы награждены орденом Отечественной войны II степени.

Поздравляем Вас с высокой государственной наградой.

До вручения ордена Вам разрешается носить орденскую ленту на планке.

СЛУЦКИЙ ГОРВОЕНКОМ.

Хаця пасля вайны Іван Паўлавіч закончыў курсы шафёраў і быў у арміі некаторы час шафёрам, але мара стаць настаўнікам не пакідала яго. Пасля заканчэння Слуцкага педвучылішча Івана Паўлавіча накіравалі ў Сяражскую школу Слуцкага раёна. Працаваў настаўнікам і бачыў у сваёй справе сэнс жыцця. Таму, нягледзячы на цяжкасці, адразу закончыў завочна Баранавіцкі дзяржаўны настаўніцкі інстытут (пасля чаго меў права выкладаць у пятых-сёмых класах), а затым і Гомельскі педагагічны.

У гады, калі ў школе адсутнічаў "фізрук", Іван Паўлавіч з маладым уздымам вёў урокі фізкультуры.

Роўна 40 гадоў вучыў Іван Паўлавіч дзяцей роднай мове і літаратуры. 40 гадоў нялёгкай працы – працы сельскага настаўніка. Далёка не кожнаму гэта па сілах.



**Янковіч Міхаіл Фёдаравіч**
**(1922 – 2014)**

У Міхаіла Фёдаравіча Янковіча лёс склаўся, як і ў большасці прадстаўнікоў яго пакалення, якое прыняло на сябе асноўны ўдар страшнага ваеннага ліхалецця, якое ўзнімала з руін разбураныя гарады і вёскі, наладжвала мірнае жыццё. Нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч 30 ліпеня 1922 года ў вёсцы Падліпцы Сяражскага сельсавета на Случчыне ў звычайнай сялянскай сям'і. У трохгадовым узросце страціў маці. Як успамінаў Міхаіл Фёдаравіч, гадаваўся ён і яго старэйшая сястра Маня пры мачысе Еве.

З самага дзяцінства праявіў хлопчык Міша цікавасць да вучобы і вялікае стараннe. Закончыўшы Падліпскую пачатковую школу, ён паступіў у Бязверхавіцкую сямігодку. Тры гады дабіраўся да школы за пяць кіламетраў у любое надвор'е. Потым рашыў паступіць у Слуцкае педвучылішча. Негледзячы на вялікі конкурс - 9 чалавек на месца - вытрымаў іспыты на выдатна і быў залічаны ў першую групу. Як радаваўся юнак, што стаў студэнтам!

У сваіх успамінах з вялікай удзячнасцю піша Міхаіл Фёдаравіч пра сваіх выкладчыкаў. Бахман Аляксандр Давыдавіч за тры гады даў веды такога ўзроўню, што юнак мог свабодна размаўляць па-нямецку на вольныя тэмы. Веданне мовы потым вельмі спатрэбілася салдату і партызанскаму сувязному Міхаілу Янковічу. З вялікай цеплынёй і ўдзячнасцю ўспамінае Міхаіл Фёдаравіч выкладчыка рускай мовы і літаратуры Скусарэўскага Нікіфара Васільевіча, Дубовіка Паўла Максімавіча, выкладчыка беларускай мовы і літаратуры.

Для заканчэння педвучылішча будучаму настаўніку пачатковых класаў Слуцкі ваенкамат даў адтэрміноўку да восені 1941 года. Апошні экзамен па педагогіцы чакаў 24 чэрвеня, а 22 чэрвеня мірнае жыццё краіны было перапынена. З болем у сэрцы слухаў юнак, як і ўсе случчане, паведамленне аб нападзе на СССР фашысцкай Германіі.

Акупацыю Міша перажыў у родных Падліпцах. Даглядаў амаль прыкаванага да ложка хворага бацьку. Партызанскімі сувязнымі перадаваў народным мсціўцам розную інфармацыю аб захопніках. А здабываць яе дапамагала тое, што ён нядрэнна валодаў нямецкай мовай.

Праз тры гады часцямі 28-й Арміі 30 чэрвеня 1944 года Слуцк быў вызвалены ад ворага. Міхаіла Янковіча прызвалі ў армію. Ён стаў аўтаматчыкам 164-га гвардзейскага стралковага палка знакамітай 55-й гвардзейскай Іркуцка-Пінскай ордэна Леніна тройчы Чырванасцяжнай ордэна Суворава імя Вярхоўнага Савета РСФСР стралковай дывізіі.

Малады салдат прымаў удзел у баях з ворагам каля Гродна, у Літве, ва Усходняй Прусіі. Асаблівае ўражанне ў радавога Янковіча выклікала масавае прымяненне агню “Кацюш” у наступальных баях у студзені 1945 года каля горада Гумбінен у Прусіі.

Тыя баі памятныя Міхаілу Фёдаравічу і іншым. У адной з атак ён быў паранены ў руку. Сам сабе зрабіў перавязку і - наперад, у наступленне. Але моцны кулямётны агонь прымусіў залегчы. Радавы Янковіч ціха агледзеўся, убачыў, што збоку ад наступаючай роты да кулямётнай кропкі ворага вядзе траншэя. Уціскаючыся ў снег, салдат папоўз да яе, потым - па ёй і неўзабаве апынуўся побач, наставіў на немцаў аўтамат і на іх мове закамандаваў кідаць зброю і падняць рукі ўверх. Наша пяхота пайшла ў атаку далей, а Янковіч здаў палонных у штаб. За той бой ад 12 студзеня 1945 года і паланенне шасці варожых салдат Міхаіла Фёдаравіча Янковіча адзначылі першай баявой узнагародай – ордэнам Чырвонай Зоркі.


Награжден орденом
Красной Звезды
№ ордена

А № 822642

ИЗВЛЕЧЕНИЯ
из „Общего положения об орденах Союза ССР"
(утверждено постановлением ЦИК и СНК Союза ССР от 7 мая 1936 г.).

1. Орден Союза ССР является высшей наградой за особые заслуги в области социалистического строительства и обороны Союза ССР.

3. Орденами Союза ССР могут награждаться как отдельные граждане, так и войсковые соединения и воинские части Рабоче-Крестьянской Красной Армии, предприятия, учреждения и организации.

4. Награжденные орденом Союза ССР могут быть за новые заслуги повторно награждены тем же или другим орденом Союза ССР.

10. Награжденные орденом Союза ССР пользуются лично правом бесплатного про-

А крыху пазней ў баях у самым Гумбінене Міхаіл Фёдаравіч атрымаў сур’ёзнае раненне ў спіну, амаль два месяцы правёў у франтавым шпіталі № 3389. Там сустрэў таксама параненых землякоў з Падліпцаў Вялянціна і Ціхана Ляткоўскіх. Як прыгадвые зараз былы франтавік, гутаркі з землякамі, успаміны аб родных мясцінах добра садзейнічалі хутчэйшаму выздараўленню. У сакавіку Янковіча са шпіталя выпісалі і па збегу акалічнасцей салдат зноў апынуўся ў сваёй роднай стралковай роце.

У хуткім часе рэшткі Трэцяга беларускага фронта былі перададзены на Першы ўкраінскі фронт, якім камандаваў Конеў.

Рухаліся ў бок Берліна. Па дарозе ўлавілі сігнал Прагі: яна прасіла дапамогі. Так полк, у якім служыў Міхаіл Фёдаравіч Янковіч, прымаў удзел ў вызваленні Чэхаславакіі. Там, у гарадку Мельнік, што недалёка ад Прусіі, і сустрэў воін Перамогу.

Але на гэтым вайна для нашага земляка не скончылася. Меткага стралка перавялі ў падраздзяленне контрразведкі дзевятага Брэсцкага Чырванасцяжнага корпуса. І яшчэ паўтара года Міхаілу Фёдаравічу давялося ачышчаць лясы ад бандытаў ў Заходняй Беларусі, Прыбалтыцы. Неяк у Даўгаўпілсе - гэта ў Латвіі - у чарговым баі салдаты падраздзялення контрразведкі ўзялі ў палон аднага з бліжэйшых памочнікаў Бандэры. За той бой Міхаіл Фёдаравіч Янковіч быў заахвочаны дваццацідзённым водпускам.

Дэмабілізавалі Міхаіла Фёдаравіча ў лістападзе 1947 года.

Работу настаўніка ў гэты час знайсці было немагчыма, бо навучальны год пачаўся першага верасня. І Міхаіл Фёдаравіч уладкаваўся ў Сяражскую школу піянерважатым.

Навучальны год 1948/1949 год пачынаў ужо настаўнікам пачатковых класаў у вёсцы Чыжоўка. Там адпрацаваў тры гады. Там сустрэў Марыю Дзям’янаўну, якая стала яго жонкай. Ужо 61 год яны разам, дзелячы на дваіх і беды, і радасці.

Потым была Бязверхавіцкая школа, у якой працаваў настаўнікам матэматыкі, а пасля выкладаў нямецкую мову.

Вельмі часта ў лёс чалавека ўключаецца выпадак, які мяняе прывычнае і ўжо наладжаннае цячэнне жыцця. Такія выпадкі здараліся і ў настаўніцкім лёсе Міхаіла Фёдаравіча. Яшчэ ў Чыжоўскую школу прыехаў інспектар райана Сухавер, матэматык па спецыяльнасці, і даў арыфметычную задачу прысутным настаўнікам, іх было пяць. Ніхто не мог рашыць тую задачу. Калі прыйшла чарга Міхаіла Фёдаравіча, ён рашыў задачу двума спосабамі. Тады інспектар параіў Міхаілу Фёдаравічу, чалавеку вельмі сціпламу, абавязкова паступаць на завочнае аддзяленне ў інстытут і вучыцца далей. Малады настаўнік

Янковіч падаў дакументы ў Баранавіцкі настаўніцкі інстытут на матэматычны факультэт. Пры паступленні пісаў сачыненне аб Радзіме. І напісаў яго ў вершах. Прыёмная камісія парэкамендавала перавесціся на літаратурнае аддзяленне, убачыўшы талент абітурыента. Што ён і зрабіў.

Так некалькі год Міхаіл Фёдаравіч, будучы студэнтам - завочнікам, выкладаў матэматыку ў Бязверхавіцкай васьмігодцы. Але аднойчы (ізноў той самы выпадак!) прыехала ў школу інспектар з Мінска, якая вельмі добра размаўляла па-нямецку з адным з настаўнікаў нямецкай мовы. У размову ўключыўся і Міхаіл Фёдаравіч і стаў упэўнена размаўляць таксама па-нямецку. Тады інспектар прапанавала Міхаілу Фёдаравічу весці гэты прадмет. І 26 год ён выкладаў нямецкую мову ў Бязверхавіцкай школе. Хоця асноўная спецыяльнасць, атрыманая ў Баранавіцкім настаўніцкім інстытуце, была беларуская мова і літаратура. Тут трэба зазначыць, якое важнае значэнне маюць любыя трывалыя веды. Маючы іх, чалавек у многіх накірунках дзейнасці будзе карысным грамадству.

За пяць гадоў да выхаду на пенсію Міхаіл Фёдаравіч ужо ўзначаліў пачатковую школу ў родных Падліпцах. Цяжкавата стала дабірацца пехатою за пяць кіламетраў да Бязверхавіч, асабліва снежнымі зімамі: парою прыходзілася ў завею дарогу, каб не збіцца, азначаць вешкамі.

У жыцці былога франтавіка, ветэрана настаўніцкай працы, было і цікавае захапленне. Больш за паўстагоддзя ён складаў вершы, прымаўкі, прыпеўкі. Міхаіл Фёдаравіч дасылаў ці прыносіў свае творы ў рэдакцыю газеты ”Слуцкі край“, выступаў з імі на мітынгах, на сустрэчах са школьнікамі.

Тэматыка яго вершаў разнастайная, але самай хвалюючай заўсёды была і ёсць тэма вайны і лёс Радзімы.

**Новік Аляксей Андрэевіч**
**(1921 – 2013)**



Новік Аляксей Андрэевіч належыць да таго пакалення, якое ў падручніках школьнай гісторыі займае перыяд ад НЭПа да нашых дзён, пакалення, на долю якога выпалі самыя неверагодныя мары і самыя жорсткія выпрабаванні. Аляксей Андрэевіч Новік большую частку жыцця працаваў настаўнікам гісторыі, дырэктарам школы, у гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у партызанскім атрадзе. Гэта чалавек з няпростым лёсам,

адбілай ў сабе час, у якім давялося жыць.

Нарадзіўся Аляксей Андрэевіч у вёсцы Іграева Слуцкага павета 27 сакавіка 1921 года ў сялянскай сям'і. Яго бацька ўдзельнічаў у Слуцкім паўстанні( 1920 год), а ў пачатку 1930-х г.быў сасланы ў Казахстан.

У канцы 1930-х Аляксей Андрэевіч пасля заканчэння Слуцкага педвучылішча выкладаў гісторыю і рускую мову пад Беластокам, у Заходняй Беларусі. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў ліку бежанцаў пешшу вярнуўся на Случчыну. З 1942 года – у партызанскім атрадзе імя 14 Слуцкіх партызан. Удзельнік вызвалення Слуцка. Пасля вайны працаваў дырэктарам школ у Васілінках, Паўстыні і Сярагах Слуцкага раёна.

За збеглымі старонкамі біяграфіі Новіка Аляксея Андрэевіча стаіць няпростая і насычанае падзеямі жыццё. Аляксей Андрэевіч пайшоў з жыцця 16 лютага 2013 года. Ён пакінуў пасля сябе добрую памяць і сваіх аднавяскоўцаў, і калегаў, і вучняў.

Зносіны з Аляксеем Андрэевічам – нібы займальнае падарожжа ў гісторыю роднага краю. Будзь то драматычныя 1930-е, вельмі цяжкія гады вайны або пасляваенны перыяд. У гэтым чалавеку заўсёды здзіўляла не толькі фактычнае веданне гісторыі, але і ўменне асэнсаваць яе, пераламаўшы праз свой уласны жыццёвы вопыт.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны Новік А. А. быў байцом партызанскага атрада імя 14-ці Слуцкіх партызан.

Але якім жа быў шлях Аляксея Андрэевіча ў партызанскі атрад?

Варта адзначыць, што да вайны ён скончыў педвучылішча ў горадзе Слуцку. Увесну 1940 года яму споўнілася 19 гадоў. Медыцынскай камісіяй быў прызнаны прыдатным да ваеннай службы ў артылерыі. У ваенкамаце пры запаўненні анкеты, у якой была графа: ”Ці ёсць хто з родных, якія жывуць за мяжой або рэпрэсаваныя органамі НКУС? “, ён напісаў: ”Бацька і дзядзька рэпрэсіраваны органамі НКУС, а бабуля была раскулачана“. Праз тыдзень яго выклікалі ў ваенкамат і ўручылі не сведчанне дапрызыўніка, як усім, а ваенны білет запасніка 2-й катэгорыі. Маладому чалавеку было вельмі крыўдна, так як ён хацеў служыць у арміі.

Пасля здачы выпускных экзаменаў у чэрвені 1940 года Новік А. А. атрымаў накіраванне ў Беластоцкае аблано. Ён працаваў загадчыкам няпоўнай сярэдняй школы ў вёсцы Паўночны востраў, дзе пражывалі ў асноўным беларусы. Яму падабалася паважлівае стаўленне насельніцтва да настаўніка. Часта малады настаўнік выступаў на сельскіх сходах з прамовамі аб сучасным становішчы. Адначасова ён разумеў, што неабходна вучыцца далей, таму рыхтаваўся да летняй сесіі, якая была прызначаная на пачатак ліпеня, бо паступіў на завочнае аддзяленне

Беластоцкага педінстытута. Увесну 1941 г. ён атрымаў павестку з райваенкамата праходзіць медыцынскую і мандатную камісію. Ваенкаму ён паведаміў, што прызываўся ў Слуцку, дзе яму прысвоілі запас 2-й катэгорыі і выдалі ваенны білет. Маёр Мядзведзеў размаўляў з ім вельмі груба, абурыўся тым, што яго накіравалі на працу ў памежную паласу і загадаў выехаць на радзіму, пакуль яго не выправадзілі.

Аляксей Андрэевіч вырашыў звярнуцца да начальніка НКВД і аб усім шчыра расказаць. На яго шчасце, начальнікам апынуўся малады адукаваны чалавек, які паабяцаў яму дапамагчы ажыццявіць яго мару – служыць у войску. І яшчэ ён дадаў, што кожную ноч мяжу пераходзяць перабежчыкі, якія запэўніваюць, што Гітлер нападзе на Савецкі Саюз. І калі пачнецца вайна, у яго не будуць пытацца пра сваякоў.

Аднак вайна пачалася нечакана-негадана. Калі па радыё выступаў Молатаў, у цэнтры сельсавета на плошчы сабралася шмат людзей. Падкаціла машына, у кузаве якой сядзелі памежнікі з вінтоўкамі. Афіцэр параіў настаўніку неадкладна сыходзіць, бо заўтра тут будуць немцы. У панядзелак з двума чамаданамі, у якіх было самае неабходнае, Новік А А пешшу адправіўся ў родныя мясціны. Яго ”падарожжа“ доўжылася два тыдні. Праз гарады і мястэчкі, лясы і палі (Бераставіца, Ваўкавыск, Слонім, Мір, Стоўбцы, Негарэлае, Мінск) ён прайшоў больш за 400 км да роднага Слуцка.

У сваіх успамінах Аляксей Андрэевіч пазначыў самыя яркія эпізоды сваёй Доўгай дарогі дадому, на працягу якой ён мог не раз загінуць.

Часам яму ўдавалася пад'язджаць на фурманках ці спадарожных машынах. Ратуючыся ад ворага, рухаліся на ўсход дзясяткі тысяч людзей: кіраўнікі дзяржаўных і партыйных устаноў, актывісты, міліцыянты-усе, хто два гады таму прыехаў на Беласточчыну ўсталёўваць савецкую ўладу. Адыходзіла шмат салдат. Калоны наганялі нямецкія самалёты і расстрэльвалі іх з кулямётаў на брыючым палёце, скідалі бомбы.

Часта вораг ішоў на хітрасць. На палявых дарогах у форме савецкіх салдат з'яўляліся групы дэсантнікаў-парашутыстаў і ва ўпор расстрэльвалі адыходзячых. Аднойчы ноччу калона, у якой быў Аляксей Андрэевіч, нарвалася на такую засаду. Ратуючыся ад куль, ён спатыкнуўся, выцяўся і страціў меншы чамадан. Спрабаваў шукаць яго ў цемры, аднак пошукі перапыніў старэйшы лейтэнант:

- Галаву ратуй, а не свае рэчы!

Яшчэ адзін эпізод, які можна назваць шчаслівым выпадкам. Аднойчы вайскоўцы ўзялі яго падвезці на двухконнай павозцы. Рухаліся

яны па лясной дарозе і раптам пачулі роў самалёта. Усе кінуліся ў розныя бакі, а праз некалькі секунд бомба ўшчэнт разнесла павозку.

2 ліпеня Аляксей Андрэевіч апынуўся ў Менску. Гарадскія кварталы выглядалі жахліва: у паветры вісеў цяжкі смурод ад пажарышчаў, трупаў людзей і коней. У горадзе ўжо гаспадарылі немцы, таму грамадзянскіх і ваенных сагналі ў адну групу. Малады нямецкі салдат вырашыў адабраць у яго новыя боты, аднак за юнака заступіўся пажылы Сівы немец, які нешта сказаў свайму таварышу, і той кінуў боты Аляксею пад ногі.

Невядома, як бы магла скласціся ў далейшым жыццё Аляксея Андрэевіча, калі б, выбраўшы зручны момант, ён не выйшаў з калоны, у якой былі ў асноўным вайскоўцы.

І яшчэ ён скарыстаўся парадай не хавацца па глухіх сцяжынках, ідучы ў Слуцк, а ісці па галоўнай дарозе. Немцы на такіх людзей не звяртаюць увагі, у адваротным выпадку могуць злавіць і расстраляць.

Каля Валяр'ян немцы спынілі ўцекачоў, сабралі іх у групы, загадалі садзіцца ў крытыя брызентам грузавікі і павезлі ў Слуцк. Машыны спыніліся на двары нафтабазы. І зноў выпадак захаваў яму жыццё. Вакол нафтабазы рос густы маліннік, у якім удалося схавацца маладому чалавеку. Ён зашыўся ў кусты, накрыўся летнім паліто, пад галаву падклаў чамадан і заснуў. Змучаны і фізічна, і душэўна, Аляксей Андрэевіч не чуў ні распачатага дажджу, які прамачыў яго да ніткі, ні таго, як у яго забралі ўсе рэчы. З пустым чамаданам, з апухлымі нагамі ён пацягнуўся па вуліцы. Моцна схуднелы, абраслы барадой, як дзед, Ён ішоў па разбураным Слуцку. Вакол былі пабітыя і спаленыя хаты, дыміліся падбітыя танкі з сіратліва чырвонымі зоркамі.

У кастрычніку па загаду гаўляйтэра Кубэ сталі адкрывацца школы. Аляксею Андрэевічу прапанавалі працу ў сямігодцы. Ён не хацеў працаваць на немцаў і адмовіўся. Аднак дырэктар сямігодкі Рудзеня В. А. патлумачыў, што ён паступае неразумна, бо яго ці ў паліцыю забяруць, ці адправяць у Нямеччыну на катаржныя працы. Зноў дапамог выпадак. Бургамістрам Слуцка быў прызначаны былы выкладчык нямецкай мовы ў педвучылішча Паволжскі немец Бахман. Да яго за радай і звярнуўся малады чалавек.

Па рэкамендацыі Бахмана яго прызначылі настаўнікам у мясцовую школу, дзе ён вёў фізкультуру і 4-ы клас. Зарплата настаўніка была мізэрнай. Паёк складаў 8 кг. мукі і 3 кг. мяса ў месяц.

Пасля Новага года ў акрузе сталі з'яўляцца партызаны. Рудзеня папрасіў Аляксея Андрэевіча, каб ён забіваў ноччу ў школе вокны і падкінуў запіску ад імя партызан, што той і выканаў разам з адным з настаўнікаў. Дырэктар наведаў з скаргай Слуцкую інспекцыю адукацыі,

і школа была зачынена, а настаўніка яшчэ некалькі месяцаў атрымлівалі паёк і сто абясцэненых марак.

Памяць Новіка А. А. захавала шмат гісторый, звязаных з вайной і першымі пасляваеннымі гадамі.

Гэтая гісторыя вельмі красамоўна кажа аб тым, як ставіліся да мясцовага насельніцтва немцы.

У роднай вёсцы Ісерна людзі па-ранейшаму штодня выходзілі на працу, стараліся выжыць, аднак і тут немцы ўсталёўвалі свае парадкі. Аляксей Андрэевіч успамінае, як аднойчы ў выхадны дзень аднавяскоўцы сядзелі на лавах каля дарогі. Нечакана з'явіўся конны атрад нямецкіх салдат. Яны пачалі зганяць пад дулам вінтовак ў кучу ўсіх, каго ўдавалася застаць на вуліцы. Чалавек пятнаццаць, у асноўным мужчын, падагналі да плота і атачылі. Зашчапкамі замкі. Людзі не разумелі, за што іх збіраюцца расстраляць. Адзін чалавек нядрэнна гаварыў па-польску, ён даведаўся ад нямецкага афіцэра, які таксама разумеў гэтую мову, што недалёка ад вёскі быў абстраляны нямецкі самалёт. Пілоты бачылі выбух за вёскай ля ракі, таму па адносінах да жыхароў вёскі будуць прынятыя карныя меры.

Яму патлумачылі, што адступаючыя чырвонаармейцы кідалі ў раку вінтоўкі, а гранаты раскіданыя паўсюль. Хлопчыкі бяруць іх і глушаць рыбу ў рацэ. Гэта тлумачэнне задаволіла немцаў, і яны адпусцілі перапалоханых людзей. Аляксей Андрэевіч пазней з жахам падумаў пра тое, што цяпер многае будзе залежаць ад выпадковасцяў, ”нітачка“ можа абарвацца ў любы момант.

Асаблівае месца ва ўспамінах Аляксея Андрэевіча займае гісторыя Слуцкага гета, бо ён быў відавочцам многіх яго трагічных старонак. Як распавядаў Аляксей Андрэевіч, усе жыхары гета былі змучаныя голадам і непасільнымі працамі, хадзілі сагнуўшыся, бледныя і Худыя, нібы прывіды. Многія не вытрымлівалі пакут і канчалі жыццё самагубствам. Асабліва было шкада глядзець на дзяцей, якія не горш дарослых разумелі трагізм свайго становішча. Яму давялося бачыць, як схуднелая бледнатвары сямігадовая дзяўчынка-габрэйка ішла па абочыне тратуара, а Адна жанчына дала ёй паўбуханкі хлеба і кавалачак сыру. Дзяўчынка кінулася ў ногі Жанчыне, плакала наўзрыд, цалавала ёй рукі.

Аднойчы па вуліцы горада ішоў мужчына-габрэй і вёў за руку схуднелага хлопчыка. Сустрэўшы знаёмага, ён разгаварыўся з ім і неспадзявана ўступіў на тратуар. Які праходзіў міма немец-эсэсавец груба ўдарыў габрэя кулаком па твары і пачаў збіваць яго нагамі. Хлопчык плакаў, хапаў немца за руку і пра нешта прасіў, але быў адкінуты ў бок, як камень, які трапіў пад нагу.

27 кастрычніка 1942 года Аляксей Андрэевіч знаходзіўся ў Слуцку па заданні партызан. Ён бачыў, як жыхароў гета выганялі на вуліцу, будавалі ў калоны па чатыры чалавекі, спачатку мужчын, дзяцей-хлопчыкаў, а потым жанчын і дзяўчынак. Іх пад аховай паліцэйскіх вялі па галоўнай вуліцы горада ў заходнім кірунку. Старых і хворых грузілі ў аўтамашыны і адпраўлялі ўслед за калонамі. Людзі ў гэтых калонах ішлі моўчкі, не плакалі, пакорліва рухаючыся насустрач сваім лёсе. Як аказалася, іх гналі да месца расстрэлу, у Гараваху, да выкапаных ям-магіл у памяці Аляксея Андрэевіча захаваўся адзін цікавы момант, звязаны з вызваленнем Слуцка.

Калі атрад імя 14-ці Слуцкіх партызан рухаўся ў бок Слуцка, нечакана ў небе з'явіўся савецкі ПО-2. Партызаны сталі радасна крычаць і махаць шапкамі. Самалёт пайшоў на пасадку і перакуліўся, зачапіўшыся за нешта колам. Падбегшы да месца аварыі, партызаны паставілі яго на ”ногі“. З самалёта вылезлі зусім не пацярпелыя лётчык і дзяўчына, якая апынулася карэспандэнтам ”Чырвонай Зоркі“. Яна распытвала ”лясных байцоў“ і фатаграфавала. У той дзень партызаны ўпершыню ўбачылі пагоны на форме нашых вайскоўцаў.

Наступная гісторыя пераносіць нас у першыя гады пасля вайны. У гэтыя самыя цяжкія пасляваенныя гады студэнты Мінскага педінстытута жылі сярод руін і пажарышчаў. Як ні дзіўна, але першымі будаўнікамі горада, па ўспамінах Аляксея Андрэевіча, былі нямецкія ваеннапалонныя. З пераможанай Германіі была прывезена будаўнічая тэхніка. На гэтых машынах у асноўным працавалі нямецкія ваеннапалонныя.

Жылі ваеннапалонныя ў бараках, спалі на нарах, засланых саломай. Студэнтаў, былых партызан і салдат, часта выкарыстоўвалі ў ролі ахоўнікаў. Аднойчы Аляксей Андрэевіч таксама ператварыўся ў канваіра, атрымаў вінтоўку з абоймай патронаў і ахоўваў ваеннапалонных, якія працавалі на будаўнічай пляцоўцы ў раёне сучаснага будынка ГУМа.

Ваеннапалонныя выглядалі схуднелымі, працавалі вельмі павольна. Кармілі іх толькі 2 разы-днём і ўвечары. Раніцай -200 грамаў хлеба і гуртка ”баланды“, а вечарам – суп і чай з цукрам. Падчас перапынку адзін з ваеннапалонных абурыўся, што іх дрэнна кормяць. Калі Аляксей Андрэевіч заўважыў, што савецкіх ваеннапалонных кармілі ў 100 разоў горш, немец адказаў, што іх было так шмат, што Нямеччына была не ў стане іх пракарміць.

Аляксея Андрэевіча абурыў гэты цынізм немца.

Як успамінае Аляксей Андрэевіч, аднойчы ў абедзенны перапынак ён сеў перакусіць. У партфелі быў кавалачак хлеба і полбанкі

кансерваў. Пажылы немец з прагнасцю глядзеў на яго, а потым прапанаваў яму абмяняць абед на прыгожы складаны нож. Калі Аляксей Андрэевіч прапанаваў яму кавалак хлеба і банку кансерваў, немец з прагнасцю накінуўся на ежу. Яго суайчыннікі глядзелі на яго з непадробнай зайздрасцю. І Аляксей Андрэевіч вярнуў яму нож з надзеяй на тое, што немец можа яшчэ раз ім скарыстацца, каб паесці. Былы вораг разгублена дзякаваў.

У той момант Аляксей Андрэевіч падумаў, што можа быць, гэты немец забіў на фронце яго бацькі ці сябра дзяцінства, а можа, нейкага сваяка, а ён яго падкормлівае. Але вайна не ажарсьцьвела яго сэрца, як і сэрцы многіх людзей, якія перажылі тую страшную вайну.

Адразу пасля вызвалення Беларусі Аляксей Андрэевіч пачаў шукаць сваіх родных. Першай знайшоў сваю сястру Надзею, якая была прызваная ў войска з Алма-Ацінскага чыгуначнага інстытута і ваявала бортрадысткой. Ад яе ён даведаўся, што бацька загінуў у 1942 годзе.

Таксама ён даведаўся, што ў іх яшчэ ёсць трохгадовая сястра Тамара. Цяпер у іх сям'і стала шасцёра дзяцей.

Аляксей Андрэевіч пачаў турбавацца, каб перавезці сваю сям'ю на вызваленую радзіму. Узімку яны вярнуліся дадому: маці, сёстры Таццяна і Тамара, брат Міхаіл. А брат Мікалай прызваўся ў войска, яго не адпусцілі ў Беларусь з Расеі, дзе ён скончыў школу.

Усё жыццё для членаў сваёй сям'і ён быў апорай і падтрымкай. Ды і сам ён стварыў сям'ю, у якой панавалі паразуменне і павага адзін да аднаго. Яго абранніцай стала Любоў Захараўна, былая сувязная і партызанка. Трое яго дзяцей выраслі годнымі людзьмі. Сын пайшоў па слядах бацькі: шмат гадоў прапрацаваў настаўнікам гісторыі на Случчыне.

Многія гады пасля заканчэння гістарычнага факультэта Магілёўскага педінстытута Новік Аляксей Андрэевіч працаваў дырэктарам школ Слуцкага раёна. Ён выконваў розныя грамадскія даручэнні: быў прапагандыстам у сістэме паліасветы сярод членаў ВКП (б), хоць заставаўся беспартыйным. Незадоўга да смерці Сталіна Аляксею Андрэевічу прапанавалі стаць сябрам ВКП( б), і ён нават падаў заяву, але з-за таго, што ён працаваў у нямецкай школе, а таксама што яго бацька і дзядзька былі асуджаныя органамі НКВД, у партыю яго не прынялі.

І толькі ў 1962 годзе Аляксея Андрэевіча прынялі ў партыю без усялякіх перашкод.

Каля сарака гадоў Новік Аляксей Андрэевіч працаваў дырэктарам розных школ Слуцкага раёна. Васемнаццаць з іх – дырэктарам Сяражскай СШ. Калі яму споўнілася 60 гадоў, ён пайшоў на пенсію, але

працягваў працаваць настаўнікам гісторыі яшчэ на працягу 6-ці гадоў. Як казаў Аляксей Андрэевіч, ён цэлы год сумаваў па школе, а потым прывык, але ніколі не губляў з ёй сувязяў. Ён часта праводзіў з навучэнцамі школы ўрокі мужнасці, выступаў на мітынгах, прымаў школьнікаў у піянеры, быў жаданым госцем на многіх мерапрыемствах, якія праводзіліся ў школе. Ды і школа ніколі не абдзяляла ўвагай свайго лепшага настаўніка і дырэктара. Калі патрабавалася дапамога па гаспадарцы, навучэнцы школы заўсёды гатовыя былі прыйсці яму на дапамогу.

Успамінаючы пройдзены шлях, Аляксей Андрэевіч адзначаў, што ён зрабіў шмат добрага і карыснага для сваёй Радзімы, для сваіх родных.

Немалую ролю ў станаўленні сваіх братоў і сясцёр сыграў і ён як старэйшы брат, якому наканавана было замяніць ім бацькі. Ацэньваючы сваю працу як настаўніка, Аляксей Андрэевіч прыводзіў словы Я. Коласа, з якім яму ўдалося сустрэцца падчас сваёй вучобы ў Інстытуце: ”Няма нічога больш важнага і ганаровага для настаўніка, чым несці асвету нашым беларускім дзецям і роднаму народу“.

Несумненна, вялікая заслуга Новіка А. А. у тым, што ў кароткія тэрміны быў узведзены новы будынак Сяражскай СШ. У размове з ім мы даведаліся, колькі яму давялося пахадзіць па розных кабінетах, арганізацыям, каб ажыццявіць мару аднавяскоўцаў. Яму даводзілася быць не толькі дырэктарам, але і забеспячэнцам, заўхозам, а часам і будаўніком.



Па яго ініцыятыве на пустцы школьнікі пасадзілі парк, які і да гэтага часу з'яўляецца ўпрыгожваннем вёскі.

Гэта быў вельмі рознабаковы, таленавіты чалавек. Цяпер цяжка ўявіць, каб дырэктар школы пісаў п'есы, якія ставіліся на школьнай сцэне вучнямі і настаўнікамі Сяражскай школы.

Яго ўзрушаючае пачуццё гумару спрыяла таму, што ў школе была вельмі добразычлівая атмасфера. Канфліктныя сітуацыі паміж калегамі або настаўнікамі і вучнямі ён умеў вырашаць бязбольна для абодвух бакоў.

краіну. Больш за 40 гадоў аддаў выхаванню маладога пакалення. Ацэньваючы працу настаўніка, ён сцвярджаў, што па сацыяльнай значнасці паставіў бы працу настаўніка на трэцяе месца пасля працы навукоўцаў і лекараў.

Аляксей Андрэевіч быў сапраўдным сельскім інтэлігентам, які вылучаўся зычлівасцю, павагай да людзей. Незадоўга да яго сыходу з жыцця ў гутарцы з настаўнікамі і навучэнцамі школы ён сказаў пра сваё жыццё наступныя словы: ”Мне грэшна скардзіцца на жыццё: яна ў мяне вялікі атрымалася“. Ён ніколі не лічыў сябе ідэальным чалавекам, сцвярджаючы, што без памылак жыццё не пражыць. Іншая справа, якія высновы робяць людзі з сваіх промахаў.

Дакрануўшыся да лёсу гэтага дзіўнага чалавека, мы можам з упэўненасцю казаць аб тым, што Аляксей Андрэевіч Новік – яркая, моцная асоба, а яго жыццё – прыклад грамадзянскага служэння сваёй краіне.



## 5. ”Знакамітыя выпускнікі“ Сяражскай сярэдняй школы



### Лістапад Міхаіл Ізмаілавіч

Нарадзіўся 3 сакавіка 1956 года ў Слуцкім раёне Мінскай вобласці ў сям'і настаўніка. Беларус. У 1973 годзе скончыў Сяражскую сярэднюю школу і паступіў у Мінскі радыётэхнічны інстытут. У 1978 годзе скончыў поўны курс названага інстытута па спецыяльнасці ”Радыётэхніка“. Пасля заканчэння інстытута быў накіраваны на працу ў НІІ сродкаў аўтаматызацыі.

Са снежня 1980 года аспірант з адрывам ад вытворчасці Мінскага радыётэхнічнага інстытута. У 1984 годзе абараніў дысертацыю на суіскание кандыдата тэхнічных навук. У 1984 годзе рашэннем ВАК СССР прысвоена вучоная ступень кандыдата тэхнічных навук.

Працаваў у Мінскім радыётэхнічным інстытуце на розных пасадах. У 1988 годзе прыняты на працу ў цэнтральны апарат Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь на пасаду галоўнага інспектара. Са снежня 1992 працаваў дырэктарам зноў створанага Вылічальна-аналітычнага цэнтра Міністэрства адукацыі – галаўной арганізацыі галіны па праблемах інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій. У 2001 годзе ў адпаведнасці з новым Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь цэнтр перайменаваны ва ўстанову ”Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтр Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь“.

З сакавіка 2016 года па цяперашні час з'яўляецца загадчыкам кафедры інфармацыйных радыётэхналогій на факультэце радыётэхнікі і электронікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі.

Мае вучоныя званні ”Старэйшы навуковы супрацоўнік“ і ”Дацэнт“, ”Прафесар“. З'яўляецца аўтарам больш за 250 навуковых прац і вынаходак.

У снежні 2001 года абараніў дысертацыю на суіскание вучонай ступені доктара тэхнічных навук па спецыяльнасці ”Тэлекамунікацыйныя сістэмы і кампутарныя сеткі“.

Падрыхтаваў чатырох кандыдатаў навук.

З'яўляецца кіраўніком першай у Рэспубліцы Беларусь кампутарнай сеткі Unibel, якая пачала прадастаўляць карыстальнікам сістэмы адукацыі і навукі доступ у глабальную сетку Internet.

Удзельнічаў у рэалізацыі шэрагу міжнародных праектаў па стварэнні і развіцці сетак тэлекамунікацый у Беларусі для сістэмы адукацыі і сацыяльнай сферы ў цэлым: быў кіраўніком праекта ”Internet“, падтрыманага Інстытутам адкрытага грамадства, у выніку рэалізацыі якога ўпершыню ў рэспубліцы была створана высакахуткасная Internet інфраструктура; кіраўніком праекта NICE, што фінансуецца камісіяй Еўрапейскіх супольнасцяў; выканаўцам праекта UNDP ”Internet“, шэрагу сумесных праектаў Інстытута ЮНЕСКА па інфармацыйных тэхналогіях у адукацыі (IITA) і інш.

З 2008 года па 2017 год з'яўляўся каардынатарам офіса праграмы Еўрапейскай камісіі Tempus (у цяперашні час - праграмы-Erasmus+). Рэалізацыя праектаў праграмы Tempus садзейнічала рэарганізацыі і аптымізацыі ўніверсітэцкага менеджменту, мадэрнізацыі навучальных планаў і праграм, умацаванню міжнароднага супрацоўніцтва Беларусі. Дзякуючы праграме з'явіліся новыя падыходы да кіравання, адміністравання, планаванні і забеспячэнні якасці вышэйшай адукацыі. У адукацыйных стандартах, навучальных планах і праграмах новага пакалення ў Беларусі стала магчыма выкарыстанне сістэмы ацэнкі, сумяшчальнай з еўрапейскай сістэмай назапашвання крэдытаў (ECTS).

Скончыў курсы замежнай мовы для спецыялістаў, якія ад'язджаюць за мяжу, пры Мінскага дзяржаўным лінгвістычным універсітэце. Свабодна валодае англійскай мовай.

Праходзіў стажыроўку ў шэрагу універсітэтаў і буйных навуковых цэнтрах: Універсітэт г. Ганалула (ЗША), Еаруасалим (Ізраіль), Універсітэт г. Магдэбург (Германія, двойчы), Універсітэт г. Падерборн (Германія), Нацыянальны даследчы Томскі політэхнічны універсітэт (Томск, Расійская Федэрацыя)

З'яўляецца кіраўніком і непасрэдным выканаўцам шэрагу праектаў у рамках рэалізацыі дзяржаўных праграм Рэспублікі Беларусь па праблемах інфармацыйных і тэлекамунікацыйных тэхналогій.

Узнагароджаны:

Ганаровай Граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Дзвюма Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Ганаровай граматай Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіяй Рэспублікі Беларусь.

Ганаровай граматай Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.

Ганаровай Граматай Вышэйшай Атэстацыйнай Камісіі.

Ганаровай Граматай Савета па супрацоўніцтву ў галіне адукацыі краін-удзельніц СНД.

Падзякай міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Уладальнік Ганаровага знака ”Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь“, узнагароджаны бронзавым медалём ВДНГ СССР.

З'яўляецца майстрам спорту СССР па фехтаванні.




## Дзве сястры-случчанкі –дзве зоркі на беларускім паэтычным небасхіле



Гісторыя беларускай літаратуры ведае нямала схем прысутнасці ў ёй такіх творчых саюзаў, як, напрыклад, ”бацька і сын“ (Адам Багдановіч і Максім Багдановіч), ”бацька і дачка“ (Іван Шамякін і Таццяна Шамякіна) і іншыя. А вось каб з адной сям’і выйшлі дзве родныя сястры, прафесійныя паэткі, члены Саюза пісьменнікаў – такога ў нашай літаратуры яшчэ не было. Нашы зямлячкі, былыя вучаніцы Сяражскай СШ Зоя Падліпская і Таіса Трафімава (у дзявоцтве Янучок), – першыя.



Таіса Трафімава нарадзілася на Случчыне. Скончыла Мінскае педвучылішча, Маскоўскі народны універсітэт мастацтваў (тэатральны факультэт) і журфак БДУ. З’яўляецца аўтарам васьмі калектыўных зборнікаў паэзіі і трох асабістых–“Усміхнуся вятрам” ( 1998 г.), “Зёлкі ад пакут”(1998 г.) і “Паспелі вішні” (2005 г.), аўтабіяграфічнай паэмы “Вёска пад ліпамі” (2011 г.), шматлікіх публікацый у рэгіянальнай і рэспубліканскай прэсе. Песні на словы Таісы Трафімавай гучалі на Славянскім базары, нацыянальных і міжнародных фестывалях у

Беларусі, Украіне, Германіі, Турцыі, Балгарыі, на Днях Беларусі ў Маскве, а таксама на шматлікіх тэлефестывалях. Многія з песен увайшлі ў Залаты фонд беларускай эстрады. Член Саюза пісьменнікаў і Саюза журналістаў Беларусі. У шэрагу ўзнагарод – нагрудны знак Саюза пісьменнікаў Беларусі “За вялікі ўклад у літаратуру” (2014 г.)



Зоя Падліпская нарадзілася на Случчыне. Скончыла Слуцкае медвучылішча, БДПУ ім. М. Танка, аспірантуру пры ім. Працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе №10 г. Слуцка, потым – у аддзеле выхаваўчай работы Слуцкага гарвыканкама, у Мінскім абласным інстытуце павышэння кваліфікацыі настаўнікаў, прарэктарам па вучэбнай рабоце у тым жа інстытуце. З’яўляецца аўтарам шматлікіх літаратуразнаўчых і метадычных даследаванняў, шасці калектыўных паэтычных зборнікаў і двух асабістых – “Палон нябёсаў” і “У вэлюме завей”; гераіняй фільма “Паэтэса Зоя Падліпская” і аўтарскай праграмы Ларыса Грынько “Лёсу свайго гаспадыня”. Песня “Малітва” на словы З. Падліпскай атрымала высокую ацэнку на міжнародным фестывалі ў Мазыры, а прадстаўнікі беларускай дыяспары Сібіры ўзялі яе з сабою ў якасці візітнай карткі нашай краіны.

Галоўны рэдактар часопіса “Роднае слова”, член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Малая радзіма Таісы Трафімавай – пасёлак Манькова на Случчыне – маляўнічы, райскі куточак. І хоць сёння ад пасёлка засталіся толькі дрэвы на былых падворках, тая родная мясціна, як сцвярджае сама паэтэса, “…дае мне сілы жыць, любіць і тварыць”. Пазней сям’я пераехала жыць у вёску Падліпцы, якой яна прысвяціла аўтабіяграфічную паэму “Вёска пад ліпамі”.

Часта мне начамі сніцца
Казка-вёсачка - Падліпцы.
Назва – услухайся якая –
Меладычная, жывая.

Пра свае дзіцячыя гады паэтэса пісала: “Сваё дзяцінства помню я мядовым, хоць часам і нішчымніца была”.

Вытокі шматграннасці таленту сясцёр, безумоўна, знаходзяцца ў іх дзяцінстве, у багатым радаводзе сям’і, з якой выйшлі паэткі. Іх прадзед Адам выпісваў кнігі ажно з Пецярбурга; бабуля Арына Адамаўна вучыла стараславянскай мове не толькі аднавяскоўцаў, але і сваіх унукаў. Заслугоўвае ўвагі і асоба бацькі, Янучка Івана Паўлавіча.

Ветэран Вялікай Айчыннай вайны, быў двойчы паранены, мае шэраг урадавых узнагарод. Ветэран педагагічнай працы. Сорак два гады выкладаў родную мову і літаратуру ў Сяражскай сярэдняй школе. З'яўляўся рэжысёрам народнага тэатра. Янучок І.П. паставіў спектаклі: “Цуд” Э. Валасевіча, “Прымакі” Я. Купалы, “Калінавы гай” А. Карнейчука, дзе яскрава стварыў вобраз пісьменніка - галоўнага героя спектакля. Захапляўся вершаскладаннем. У 2000 г. Янучок І. П. напісаў аўтабіяграфічную паэму, прысвечаную сваёй матулі Шахновіч Арыне Адамаўне (захоўваецца рукапісны варыянт). Менавіта пад уплывам бацькі развіваліся таленты дзяцей. Вось як аб гэтым гаворыць у сваёй паэме “Вёска пад ліпамі” Таіса Трафімава:

Бацька вельмі хваляваўся,
Да спектакляў рыхтаваўся,
Колькі іх было, гастроляў,
У клубе, вёсках, на раёне!
А класічныя шэдэўры…
І зусім не для кар’еры,
А па закліку душы.
Да распяцця на крыжы
Быў акцёрам, фантазёрам.
У маскоўскіх рэжысёраў
Ён майстэрству навучыўся.
Слуцкі край ім ганарыўся.
Мы – таксама. Бачаць зоры.
У душы і мы акцёры,
Пэўна, бацькавая школа
Успамін, як птах над полем…

Трэба адзначыць, што яшчэ адна грань таленту Таісы Трафімавай – захапленне тэатрам. Яна з’яўлялася актрысай Мінскага абласнога драматычнага тэатра:

Пад уплывам бацькі, ясна,
Іскра божая не згасла…

Захапленне тэатрам прыйшло да Таісы Трафімавай менавіта ў школьныя гады, калі ў Сяражскую сярэднюю школу была накіравана з Мінска маладая настаўніца рускай мовы і літаратуры Чысцякова Таццяна Іванаўна. Яна часта ставіла інсцэніроўкі па творах класікаў. Заўважыўшы ў дзяўчынкі артыстычныя здольнасці, даручала ёй галоўныя ролі.

Будучы актрысай Мінскага абласнога драматычнага тэатра ў Маладзечне, Таіса Трафімава сыграла шмат запамінальных роляў, самай яркай з якіх стала роля Маці-Беларусі ў спектаклі “Кастусь Каліноўскі”.

На ўсё жыццё яна запомніла бацькавы ўрокі акцёрскага майстэрства: “Іграй не на памер глядзельнай залы, а на Космас!..”

У школьныя гады узнік і інтарэс да журналістыкі. Стартавай пляцоўкай у журналістыку стаў артыкул пра школьны выпускны баль, які быў надрукаваны ў слуцкай раённай газеце “Шлях Ільіча” (цяпер газета “Слуцкі край”).

У сям’і Янучкоў панавалі ўзаемапаразуменне і павага да кожнага, а дзяцей (іх было шасцёра) з калыскі вучылі разумець і шанаваць адзін аднаго, людзей, цягнуцца да навукі.

Марым, нешта выдумляем,
Казкі, песенькі складаем.
Не ўлягалі надта ў цацкі,
Што куплялі маці з бацькам.
Кнігі, сшыткі і паперкі,
Лепш былі нам за цукеркі.
Паміж нас былі й салісты.
Як вядомыя артысты,
Пелі у рупар – чапялу
Песні нашаму сялу.
Мікраклімат… Атмасфера…
Не апішаш на паперы.

Спрыяльная маральная атмасфера, якая панавала ў сям’і, прывіла дзецям тыя каштоўныя духоўныя якасці, што садзейнічалі станаўленню дзяцей і іх творчаму ўзлёту.

Разумнай і таленавітай была і маці Ганна Канстанцінаўна:

А каторы раз, бывала,
Сшыткі мама правярала,
Бо навукі свет спазнала,
Стаць настаўніцай жадала.
Быць бы педагогам ёй,
Каб не сцёрся лёс вайной…

Ад яе ўзялі дзеці ўменне адчуваць прыгажосць. Яна была выдатнай майстрыхай:

Помню маміныя кросны.
Часта ўзімку, і ў вёсны
Аж да позняй ночы ткала
І пасаг нам рыхтавала.
Залаты быў час такі –
Ткаць абрусы, дыванкі…
Каб на радасць, не на ліха,
Нібы Слуцкая ткачыха,

З промняў чыстае расы
Небывалае красы
Ручнікі і капы ткала,
Кутасамі аздабляла.

А яшчэ яна вельмі хораша спявала, і ўсе дзеці атрымалі ў дар яе талент. Дзеці вучыліся іграць на музычных інструментах, а іх бацька нават у 80 гадоў браў у рукі баян. Пройдуць гады – і Таіса Трафімава напіша гімн гармоніку, які стане візітнай карткай абласных і міжнародных фестываляў "Грай, гармонік". Свой сямейны ансамбль у памяць маці яны назвалі "Анюціны вочкі". На жаль, маці не стала вельмі рана: калі Таісе было 17, а Зоі ўсяго 7 гадоў…

Як холадна, як крыўдна, як балюча,
І вецер сіверам у вочы б'е калюча.
Пякельны боль мой не сплыве слязінай.
Дзе дзецца беспрытульнай сіраціне?..

– гэтак напісала яшчэ калі была зусім юнай старэйшая сястра. А праз 17 гадоў напіша і малодшая:

Як цяжка жыць, матулечка, на свеце.
Як горка нам, тваім сіротам дзецям
Бы тыя касачы, схіліліся пад ветрам.
Як месяц уначы, ты нам патрэбна.
Як сонейка ўдзень, глыток паветра.
Ты кожнаму з дзяцей
Жывой патрэбна…

Маці дзецям замяніла старэйшая сястра, а ўся сям'я дапамагала і падтрымлівала таленавітых дзяўчат у пошуках імі жыццёвых шляхоў.

Такім чынам, можна з упэўненасцю гаварыць, што таленты сясцёр узніклі і развіліся менавіта ў іх вялікай і дружнай сям'і, дзе бацькі выхоўвалі дзяцей на беларускіх народных традыцыях, вучылі шанаваць гісторыю свайго роду, усё рабілі для таго, каб іх дзяцінства было шчаслівым, багатым на светлыя, пазітыўныя, узвышаныя пачуцці. Нездарма, гаворачы пра ўплыў сям'і на развіццё шматграннасці яе талентаў, Таіса Трафімава ўзгадвае словы вядомага педагога У.Сухамлінскага: "Жыццё дзіцяці паўнацэннае толькі тады, калі яно жыве ў свеце гульні, казкі, фантазіі, без гэтага яно – засушаная кветка".

Першай у паэзію прыйшла старэйшая – Таіса, прыйшла сама, натуральна і лёгка, як звычайна і ўваходзяць у паэзію. Вось як аб гэтым гаворыць яна сама: " Аднойчы мая сястра Ларыса сказала:" Я пайду па ваду, а ты не чапай майго сшытка і не чытай, што я там напісала". Мы выхоўваліся правільна, чужога не бралі, таму я не зразумела, што гэта была за такая нечаканая забарона. Адкінула падушку, а там – асабісты

дзённік, а ў ім вершы пра каханне. Памятаю, я тыды яшчэ падумала, што, напэўна, у кожнага чалавека павінна быць асабістае, патаемнае. І я таксама завяла дзённік. Але першыя пачуцці мяне тады пакуль што не краналі, таму ён быў падобны на сшытак добрых спраў, у які я запісвала, як дапамагала бабулі. Ужо тады я выношвала патаемную мару: пісаць самой. Выкладчыкі журфака БДУ усур'ёз зацікавіліся маімі вершамі і вымусілі мяне больш уважліва ставіцца да сваіх паэтычных здольнасцей".

А вось гісторыя першых зносін Зоі з паэтычным словам мае крыху пацешную і па-дзіцячы мілую афарбоўку.

Аднойчы 17-гадовая Таіса, якая на той час ужо спрабавала пісаць вершы, павінна была некуды тэрмінова адлучыцца з хаты і, каб нечым заняць сваю 7-гадовую сястрычку, дала ёй чысты аркуш і аловак ды наказала: " Так, Зойка, я прыйду недзе праз гадзінку, а ты, пакуль мяне не будзе, каб напісала верш! Прыйду – праверу!" Зоя Іванаўна і сёння памятае той вершык "Працаўнік-бабёр":

З раніцы да ночы
Працуе наш бабёр.
Пападпухалі вочы,
І поту не абцёр.
Ён так напрацаваўся,
Што падаў на падлогу,
Ён падаў – падымаўся,
Але не зваў падмогу.
І вось устаў бабёр уночы,
Да рэчкі хуценька ідзе,
Там працірае свае вочкі,
На хату латку ён кладзе…"

З таго часу, як жартуе Зоя Іванаўна, яна і працуе, як той бабёр-працаўнік.

Пазнаеміўшыся з вершамі Т.Трафімавай і З. Падліпскай, паэмай Т.Трафімавай "Веска пад ліпамі", якую часта параўноўваюць з паэмай Якуба Коласа "Новая зямля" можна прысці да вываду, што галоўная тэма ў большасці вершаў дзвюх сясцёр – дарагія сэрцу людзі, родны кут. Першая прэзентацыя зборніка сясцёр "Паспелі вішні" адбылася на радзіме – на знакамітай Манькоўскай паляне, дзе пад буслянкай – сімвалам дзяцінства і бацькоўскага дома – штогод у вызначаны час збіраецца больш за 100 сваякоў. "Вёска пад ліпамі" – так называецца новая паэма Таісы Трафімавай. Гэта сапраўдны гімн, кранаючае прызнанне ў любві і адданасці сваёй маленькай радзіме, сваёй вялікай і незвычайнай сям'і.

Яшчэ адна характэрная рыса творчасці сясцёр-паэтэс – услаўленне прыгажосці, глыбіні беларускага слова, захаванне беларускай спадчыны. Сярод самых шчырых, пранікнёных вершаў Таісы Трафімавай верш "Мова" - сапраўдны гімн у гонар матчынай мовы:

Якая ж ты высакародная,
Мова мая родная!
Гучная, урачыстая.
Як продкаў вытокі – чыстая…
Мова мая, гаротная,
Мова мая народная,
Простая і святая
Родная мова – жывая.

Ва ўнісон з гэтымі радкамі гучаць радкі верша "Мова" Зоі Падліпскай:

Люблю беларускую мову.
Такую пяшчотную,
Узвышаную
І спрадвечную.
Цяпер адраджаецца мова,
Не раз таптаная…
Як добра, што роднае слова
Не растаптанае!

Што яшчэ вылучае паэзію сясцёр-случчанак? На наш погляд, гэта матыў радзімы як з'явы чалавечай высакароднасці. Пра гэта гавораць радкі з верша Зоі Падліпскай "Случчыне":

Тут родныя трымаюць карані
І салаўі спяваюць гэтак дзіўна.
Мой лёс, прашу, мяне абарані,
Не дай чужою стацца на радзіме.

Нашы таленавітыя землячкі актыўна супрацоўнічаюць з галоўнай рэдакцыяй літаратурна-драматычных праграм Белдзяржтэлерадыё. Яны ўдзельнічалі ў цыклах перадач "Шчырага сэрца парывы", "Мова-душа народа", "Белы аркуш". Некаторыя з іх выхаванцаў, удзельнікаў літаратурных аб'яднанняў, якімі ў пэўныя часы кіравалі паэтэсы, маюць ужо ўласныя зборнікі вершаў.

Знаходзяць час паэтэсы і для творчых паездак па роднай Случчыне, пад-час якіх правялі цыкл незабыўных сустрэч "Вяртанне да вытокаў".

Т.Трафімава ў межах міжнароднага праекта "Гістарычна-культурная спадчына Агінскага", які праходзіць пад эгідай ЮНЕСКА, выступала ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Літве, у Фларэнцыі, у

Францыі. У сваім інтэрв'ю, якое размешчана на старонках вядомага беларускага часопіса, яна сказала, што пасля паездак за мяжу " …я адчувала незвычайны творчы ўздым і прыналежнасць да агульнай вялікай справы захавання творчай спадчыны славутага суайчынніка". І яшчэ яна ўзгадала словы свайго бацькі Івана Паўлавіча, якога, на жаль, ужо няма: "Калі дабіваешся поспеху ў сваёй краіне, ты ўслаўляеш сваё імя, а калі за яе межамі – ты ўслаўляеш імя сваёй краіны".

Бацькавы наказы вельмі дапамагаюць у жыцці і творчасці яго дзецям. Чаму вершы сясцёр такія прыцягальныя, цёплыя, яскравыя? Нам здаецца, таму, што ў іх прысутнічаюць светлыя душы паэтэс, якія фарміраваліся і пад уплывам бацькоўскіх наказаў. Пра іх вельмі цудоўна сказала Таіса Трафімава ў паэме "Вёска пад ліпамі":

Каранёў не выракайся,
Іх шануй, як бацьку й маці,
Пакланісе роднай хаце,
Што дала для ўзлёту крылы,
Узлятай пад краем мілым,
Мовай роднай не цурайся,
Да вытокаў зноў вяртайся!
Ты – часцінка Беларусі,
На цябе я спадзяюся…
Дзе б ні быў, сваёй зямліцай
Не саромся ганарыцца!

Вось такіх цудоўных жанчын-паэтэс падарыла беларускай зямлі Случчына.





## 6. ”Яны закончылі Сяражскую сярэднюю школу з залатым і сярэбраным медалём“

**1953/1954 навучальны год**

Пракаповіч Ларыса Фёдараўна (залаты медаль)
Ярота Зінаіда Рыгораўна (сярэбраны медаль)

**1954/1955 навучальны год**

Супрыяновіч Іван Яфімавіч (залаты медаль)
Кулікоўская Лідзія Іванаўна (залаты медаль)
Пракаповіч Роза Іванаўна (залаты медаль)
Шахновіч Валянціна Ціханаўна (сярэбраны медаль)

**1955/1956 навучальны год**

Басалыга Вера Серафімаўна (залаты медаль)
Дробуш Барыс Кузьміч (залаты медаль)
Дубалека Валянціна Фёдараўна (сярэбраны медаль)
Ткач Нэла Аляксееўна (сярэбраны медаль)
Біран Антаніна Наумаўна (сярэбраны медаль)
Ярота Марыя Рыгораўна (сярэбраны медаль)

**1960/1961 навучальны год**

Лабановіч Алена Парфір'еўна (сярэбраны медаль)

**1965/1966 навучальны год**

Сцепановіч Жана Фёдараўна (сярэбраны медаль)
Біран Барыс Наумавіч (сярэбраны медаль)

**1977/1978 навучальны год**

Васілевіч Мікалай Змітрыевіч (залаты медаль)

**1982/1983 навучальны год**

Спадабаева Ірына Паўлаўна (залаты медаль)
Шклярэўскі Аляксандр Мікалаевіч (залаты медаль)

**1983/1984 навучальны год**

Дробуш Раіса Міхайлаўна (залаты медаль)

**1987/1988 навучальны год**

Барысавец Наталля Аляксандраўна (сярэбраны медаль)
Новік Анатоль Леанідавіч (сярэбраны медаль)

**1989/1990 навучальны год**

Шахновіч Алена Мікалаеўна (залаты медаль)
Шклярэўская Таццяна (залаты медаль)

**1991/1992 навучальны год**

Шахновіч Таццяна Мікалаеўна (залаты медаль)
Мынзул Галіна Уладзіміраўна (сярэбраны медаль)

**1992/1993 навучальны год**

Райкевіч Руслан Уладзіміравіч (залаты медаль)
Скарына Людміла Анатольеўна (сярэбраны медаль)

**1994/1995 навучальны год**

Лятун Аксана Мікалаеўна (залаты медаль)

**1997/1998 навучальны год**

Кавальчук Святлана Леанідаўна (залаты медаль)

**2002/2003 навучальны год**

Кавалёва Марыя Сяргееўна (сярэбраны медаль)

**2014/2015 навучальны год**

Каштальян Марыя Сяргееўна (залаты медаль)



## 6. Дасягненні Сяражскай сярэдняй школы

### 2017/2018 навучальны год

Па выніках школьных прадметных алімпіяд у 2017/2018 навучальным годзе на ўдзел у другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах для вучняў 4-11 класаў былі накіраваны – 5 вучняў (2016/2017 н.г. – 4 вучні):

- па матэматыцы – Нікіціна Аляксандра,вучаніца 4 класа (27-28 месца);
- па беларускай мове – Нікіціна Аляксандра,вучаніца 4 класа (14-15 месца);
- па рускай мове – Даманская Анастасія, вучаніца 5 класа, Д-3;
- па беларускай мове – Алешка Аміна, вучаніца 5 класса (33-е месца);
- па геаграфіі – Радзюкевіч Яна, вучаніца 8 класа (22 месца);
- па беларускай мове – Янучок Наталья, вучаніца 10 класа, 16-е месца (2016/2017 - 20-21-22 месца).

Вучні школы прымалі ўдзел у алімпіядах:

- па прававых ведах: 4 вучні (месцы: 22 месца -8 клас, 27 месца-9 клас,30-10 клас, 33 месца-11 клас);
- па правілах дарожнага руху: Д-3 (2016/2017н.г.-7).

У 2017/2018 навучальным годзе вучні дзяржаўнай установы адукацыі “Сяражская сярэдняя школа” прынялі ўдзел ў дыстанцыйнай алімпіядзе па геаграфіі, матэматыцы, рускай мове, беларускай мове, англіскай мове, грамадазнаўству (2016/2017 навучальны год-па геаграфіі, матэматыцы, рускай мове, англіскай мове і нямецкай мове). Была падрыхтавана работа на конкурс даследчай дзейнасці малодшых школьнікаў “Я-даследчык” вучаніцай 4 класа Нікіцінай Аляксандрай “Дзяўчаты мінулай вайны” (дыплом 3-й ступені) ( 2016/2017 н. г.- дыплом 2-й ступені).

Вучні і педагогі школы прынялі ўдзел у XI Маладзёжнай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Вялікая Айчынная вайна 1941-1945 гадоў у гістарычнай памяці народа” і ўзнагароджаны дыпломам 2-й ступені (2016/2017 н.г.- у міжнародным конкурсе “Еўраконкурс” “Эхо войны – голос Победы”атрымалі 3 дыпломы 1- й ступені) і Падзякай.

Вучні школы – пастаянныя ўдзельнікі спартыўных раённых спаборніцтваў, 12 спаборніцтваў (2016/2017 н.г. - 10 спаборніцтваў):

- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па валейболе на Кубак РК ГА “БРСМ” у рамках Сусветнай Кампаніі супраць СНІДУ;

- удзел вучняў у раённым лёгкаатлетычным кросе ў рамках XXX спартакіяды, Д3-1;
- удзел вучняў у раённым веснавым лёгкаатлетычным кросе ў рамках XXX спартакіяды;
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па баскетболе сярод дзяўчынак у рамках XXX спартакіяды, Д2-1;
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па кулявой стральбе ў рамках XXX спартакіяды;
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па настольным тэнісе ў рамках XXX спартакіяды;
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па плаванні;
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па летнім шматбор'і "Здароўе", Д2-1;
- удзел вучняў у спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы "Шкаліяда";
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па валейболе сярод дзяўчынак рамках XXX спартакіяды, Д3-1;
- удзел вучняў у эстафеце "Туристский калейдоскоп», Д2-1;
- удзел вучняў у спаборніцтвах па спартыўнаму арыентаванню, Д1-1, Д2-1 .

Вучні школы прымалі ўдзел у XVI раённай алімпіядзе па прадмеце Фізічная культура і здароўя" у рамках XXX спартакіяды. У выніку вучаніца X класа Падліпская Аляксандра атрымала дыплом 2-ой ступені (2016/2017 н.г. –прымалі ўдзел у раённай алімпіядзе па прадмеце "Фізічная культура і здароўя").

Па выніках XXX спартакіяды сярод школьнікаў устаноў адукацыі Слуцкага раёна дзяржаўная ўстанова адукацыі "Сяражская сярэдняя школа" заняла 4 месца (2016/2017 н.г. – 8 месца).

Выніковасць удзелу вучняў у творчых конкурсах у 2017/2018 навучальным годзе:

| № | Назва конкурса | Месца (раённы узровень) | Месца (абласны узровень) |
|---|---|---|---|
| 1. | Конкурс декаратыўна-прыкладной творчасці «Калядная зорка» у намінацыі декаратыўна-прыкладная творчасць | Д1-2, Д2-1 | |
| 2. | Агляд-конкурс «Спасатели глазами детей» | Д1-2 Д3-1 | Д2-1 |
| 3. | Конкурс-выстава юных фларыстаў «Лёд. Цветы. Фантазия» | Д3-1 | |
| 4. | Конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка: прысвячэнне маёй Радзіме» | Д2-1 | |
| 5. | Конкурс на лепшую сувенірную работу | Д1-1 | Д3-1 |
| 6. | Конкурс «Моя первая модель» | Д2-1 | |
| 7. | Агляд- конкурс піянерскіх агітбрыгад «Запалі агонь дабра!» | Д2-1 | |

| № | Назва конкурса | Месца (раённы узровень) | Месца (абласны узровень) |
|---|---|---|---|
| 8. | Конкурс «Дорогами памяти» | Д1-1 | |
| 9. | Конкурс «Топонимика родного края» | Д1-1 | |
| 10. | Конкурс «Техноёлка» | Д3-1 | |
| 11. | Конкурс «Маёй зямлі вянкі сплятаю» | Д2-1 | |
| | | 15 (2016/2017-10) | 2 (2016/2017-1) |

## 2018/2019 навучальны год

На працягу вучэбнага года педагогі школы з’яўляліся ўдзельнікамі конкурсаў педагагічнага майстэрства абласнога ўзроўню: Буканава Таццяна Мікалаеўна прымала ўдзел у абласных краязнаўчых чытанях “Мае славутыя землякі” на базе МАІРА; Салавей Наталля Геннадзьеўна прымала ўдзел у абласным этапе конкурса на лепшую сувенірную работу сярод педагогаў і атрымала дыплом 3 ступені; Ануфрэенка Яўгенія Васільеўна і Буканава Таццяна Мікалаеўна прымалі ўдзел у абласным этапе Рэспубліканскай выставы-конкурсу навукова-метадычных матэрыялаў і педагагічнага вопыту па арганізацыі турысцка-краязнаўчай і эколага-біялагічнай работы з дзецьмі і моладдзю, прысвечанай Году малой радзімы (намінацыя “Зборнік метадычных матэрыялаў і праектаў”, “Времён связующая нить”); Акуловіч Наталля Іванаўна і Юнах Галіна Сцяпанаўна прымалі ўдзел у абласным конкурсе “Педагагічная ІТ-мазаіка” “ЭАС у агульнай сярэдняй адукацыі” “ЭАС у дашкольнай і пачатковай адукацыі”; Ануфрэенка Яўгенія Васільеўна прымала ўдзел у абласной метадычнай эстафеце “Вопыт і маладосць: супрацоўніцтва або альтэрнатыва”.

Вучні і педагогі школы прымалі ўдзел у конкурсах даследчых работ (2017/2018 н.г. - вучні і педагогі школы прынялі ўдзел у ХI Маладзёжнай міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі “Вялікая Айчынная вайна 1941-1945 гадоў у гістарычнай памяці народа” і былі ўзнагароджаны дыпломам 2-й ступені):

– раённы этап рэспубліканскага конкурсу даследчых работ “Спадчына Беларусі” ў намінацыі “Матэрыяльная культура” – Д-2;

– раённы этап рэспубліканскага конкурсу “Не меркнет летопись побед” у намінацыі “Своих героев не забудем имена” з прадстаўленнем даследчай работы “Людзі асаблівага склада” – Д-1;

– раённы конкурс работ даследчага характару ў секцыі “Руская мова і літаратура” – Д-2;

– раённы конкурс работ даследчага характару ў секцыі “Беларуская мова і літаратура” – сертыфікат удзельніка атрымалі.

Вучні школы – пастаянныя ўдзельнікі спартыўных раённых спаборніцтваў, 12 спаборніцтваў (2017/2018 н.г. - 12 спаборніцтваў):

- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па баскетболе у рамках XXXI спартакіяды (27 і 4 месцы);
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па футболу ў рамках XXXI спартакіяды (13 месца);
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па шахматам ў рамках XXXI спартакіяды, Д-1;
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па зімнім шматбор'і “Здароўе” (27 месца);
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па зімняму “Абаронцу Айчыны” (16 месца);
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па гандболу сярод дзяўчынак ў рамках XXXI спартакіяды, Д-3;
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па настольным тэнісе ў рамках XXXI спартакіяды (9 і 9 месцы);
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па летнім шматбор'і “Здароўе” (10 месца);
- удзел вучняў у раённых спаборніцтвах па летняму “Абаронцу Айчыны” (27 месца);
- удзел вучняў у спаборніцтвах па лёгкай атлетыцы “Шкаліяда” (16 месца);
- удзел вучняў у спаборніцтвах па спартыўнаму арыентаванню, Д-3.

Вучні школы прымалі ўдзел у XVII раённай алімпіядзе па прадмеце Фізічная культура і здароўя” у рамках XXXI спартакіяды – 10 месца (2017/2018 н.г. – Д-2).

Па выніках XXXI спартакіяды сярод школьнікаў устаноў адукацыі Слуцкага раёна дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сяражская сярэдняя школа” заняла 9 месца (2017/2018 н.г. – 4 месца).

Выніковасць удзелу вучняў у творчых конкурсах у 2018/2019 навучальным годзе:

| № | Назва конкурса | Месца (раённы узровень) | Месца (абласны узровень) |
|---|---|---|---|
| 1. | Раённы конкурс фатаграфій “В лучах материнской любви” | Д1-1, Д2-1 | |
| 2. | Раённы конкурс “Калядная зорка” у намінацыі “Калядная композиция” | Д3-1 Д1-1 | |
| 3. | Вынікі Слуцкай “Турыяды”, у намінацыі “Краеведческая работа” | Д3-1 | |
| 4. | Конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка: прысвячэнне маёй Радзіме» | Д2-1 | |
| 5. | Конкурс на лепшую сувенірную работу | Д1-2 | Д3-1 |

| № | Назва конкурса | Месца (раённы узровень) | Месца (абласны узровень) |
|---|---|---|---|
| 6. | Раённы этап абластнога смотра-конкурса дзіцячай творчасці “Дети. Вода. Безопасность” | Д2-1 | |
| 7. | Раённы этап рэспубліканскага конкурса “Спасатели глазами детей” | Д1-1 | |
| 8. | Абласны конкурс выяўленчага мастацтва «Мир моими глазами» | Д2-1 | |
| 9. | Раённы конкурс відэафільмаў “Люблю мой край” у намінацыі “Девушки прошлой войны” | Д3-1 | |
| 10. | Раённы конкурс “Добрая книга своими руками” | Д2-1<br>Д3-1 | |
| 11. | Раённы тур абласнога этапа Рэспубліканскага конкурса «Иди за мечтой» | Д2-1<br>Д1-1 | |
| 12. | Рэспубліканскі творчы конкурс юных чытальнікаў «Жывая класіка: прысвячэнне малой Радзіме» | Д1-1 | |
| | | 16 (2017/2018-15) | 1 (2017/2018-2) |

## 2019/2020 навучальны год

Па выніках школьных прадметных алімпіяд у 2019/2020 навучальным годзе на ўдзел у другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах для вучняў 4-11 класаў былі накіраваны – 4 вучні (2018/2019 н.г. – 3 вучні):

– па фізіцы – Клішэўскі Аляксандр, вучань 9 класа (дыплом III ступені – 3,45 бала (6,9%));

– па беларускай мове – Нікіціна Аляксандра, вучаніца 6 класа (дыплом III ступені – 12 балаў (40%));

– па рускай мове (гімназічная алімпіяда) – Даманская Анастасія, вучаніца 7 класа (дыплом III ступені – 29 балаў (66,67%)).

Таксама Нікіціна Аляксандра, вучаніца 6 класа прыняла ўдзел у раённым этапе абласнога конкурсу “Школа бяспекі – 2020” і атрымала дыплом II ступені.

У 2019/2020 навучальным годзе вучні дзяржаўнай установы адукацыі “Сяражская сярэдняя школа” прынялі ўдзел ў дыстанцыйнай алімпіядзе: па матэматыцы (Нікіціна Аляксандра, 6 клас – дыплом II ступені, (13 балаў, 65%); па інфарматыцы (вучань 8 класа Янучок Данііл выканаў 42% заданняў). Вучні школы таксама прымалі ўдзел у інтэрнэт-алімпіядзе па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі (8 клас – 1 вучань), па матэматыцы (Нікіціна Аляксандра, вучаніца 6 класа выканала 66,7% заданняў), па фізіцы (Янучок Данііл, вучань 8 класа выканаў 70% заданняў) (2017/2018 навучальны год – па геаграфіі, матэматыцы, рускай мове, англіскай мове, беларускай мове, грамадазнаўству).

У дзяржаўнай установе адукацыі “Сяражская сярэдняя школа” вядзецца актыўная работа па грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню. Быў абагульнены вопыт школы па выкарыстанню інавацыйных форм і метадаў работы з дзецьмі і моладдзю ў дадзеным накірунку выхаваўчай работы. Так, намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Ануфрыенка Я.В., настаўнік рускай мовы і літаратуры Буканава Т.М. у лістападзе 2019 года прынялі ўдзел у рэспубліканскім конкурсе музеяў устаноў адукацыі “Во славу общей Победы” у намінацыі “Апісанне формаў і метадаў дзейнасці ўстановы адукацыі па ўвекавечанні імёнаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны”, былі ўзнагароджаны дыпломам I ступені (раённы ўзровень), дыпломам II ступені на рэспубліканскім узроўні. Таксама Буканова Т.М., настаўнік рускай мовы і літаратуры, 5 лістапада 2019 года прымала ўдзел у абласных краязнаўчых чытаннях педагогаў “Мае славутыя землякі” ў рамках рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі “Я гэты край Радзімаю заву» з працай “Дзве сястры-случчанкі – дзве зоркі на беларускім паэтычным небасхіле” (атрымала пасведчанне ўдзельніка ў МАІРА). Ліпінскі Даніла Андрэевіч, навучэнец 9 класа (ІПР) прыняў удзел у рэспубліканскім конкурсе фотаработ “Мой край родны” з работай “Дом маіх продкаў” пад кіраўніцтвам класнага кіраўніка Кіслячонак Г.В. і атрымаў дыплом III ступені на вобласці. У сакавіку 2020 года аўтарскі калектыў Сяражскай сярэдняй школы прыняў удзел у раённым конкурсе метадычных распрацовак па правядзенні шостага школьнага дня, атрымаў дыплом I ступені (дадзеная праца была накіравана для ўдзелу на абласным узроўні). Вучні школы пад кіраўніцтвам педагога дадатковай адукацыі Салавей Н.Г. прымалі ўдзел у абласным этапе рэспубліканскага конкурсу “Иди за мечтой” у намінацыях “Сувенір” (Нікіціна Аляксандра, вучаніца 6 класа, атрымала дыплом 3 ступені) і “Мастацкая фатаграфія” (Лях Максім, вучань 6 класса, атрымаў дыплом 3 ступені). Педагог дадатковай адукацыі Салавей Н.Г. прыняла удзел у абласным этапе конкурсу на лепшую сувенірную работу сярод педагогаў у намінацыі “Цестапластыка” з работай “Куток маёй душы” ( дыплом 1 ступені атрамала на раённым этапе, дыплом 3 ступені – на абласным узроўні).

У 2019/2020 навучальным годзе вучні школы прымалі ўдзел у конкурсах даследчых работ (2018/2019 н.г. – вучні школы прынялі ўдзел у раённым этапе конкурса даследчых работ: секцыя беларускай мовы і літаратуры (Нікіціна Аляксандра, вучаніца 6 класа, атрымала сертыфікат удзельніка); секцыя рускай мовы і літаратуры (Кастрыца Дар’я і Кудзіярава Анастасія, атрымалі дыплом 2 ступені); раённым этапе рэспублiканскага конкурсу даследчых работ “Спадчына Беларусі”

ў намінацыі "Матэрыяльная культура" (дыплом 2 ступені); раённым этапе рэспубліканскага конкурсу "Не меркнет летопись побед" у намінацыі "Своих героев не забудем имена" з прадстаўленнем даследчай работы "Людзі асаблівага склада" (дыплом 1 ступені)):

– абласны этап конкурса даследчых работ у секцыі рускай мовы і літаратуры (Кастрыца Дар'я і Кудзіярава Анастасія, вучаніцы 9 класа, на абласным узроўні атрымалі 2 падсвечанні ўдзельнікаў);

– абласны этап фестывалю малодшых школьнікаў "Я – даследчык" з работай (секцыя гуманітарных ведаў) "Как огнеборцем стать, чтоб от пожаров мир спасать!" (на раённым узроўні – дыплом 1 ступені, на абласным узроўні – падсвечанне пераможца).

Вучні школы – ўдзельнікі спартыўных раённых спаборніцтваў, 4 спаборніцтвы (2018/2019 н.г. – 12 спаборніцтваў):

– удзел у адкрытым Кубку Слуцкага раёна па спартыўнаму арыентаванню "Осення призма" (дыплом 2 ступені);

– удзел у адкрытым Кубку Слуцкага раёна па спартыўнаму арыентаванню "Слуцкая восень" (дыплом 3 ступені – агульнае месца каманды школы, дыплом 3 ступені – асабістае месца);

– удзел у адкрытым Кубку Слуцкага раёна па спартыўнаму арыентаванню: двухэтапаная эстафета (дыплом 1 ступені – агульнае месца каманды школы);

– удзел у спаборніцтвах па спартыўнаму арыентаванню "Мандариновый спринт" (дыплом 2 ступені).

Па выніках ўдзелу вучняў у другім этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах для вучняў 5-11 класаў бачна станоўчая дынаміка вучэбных дасягненняў вучняў.

У 2019/2020 навучальным годзе былі паказаны наступныя вынікі:

| № п/п | Назва конкурсу | Узнагарода |
|---|---|---|
| 1. | Раённы конкурс-выстава тантамарэсак "Беларусь мая сінявокая" ў намінацыі "Персанажы беларускага фальклору" | 1 – Д3 (раён) |
| 2. | Адкрыты Кубак Слуцкага раёна па спартыўным арыентаванні "Восеньская прызма" | 1 – Д2 (раён) |
| 3. | Раённы конкурс фотаздымкаў "У промнях матчынай любові" у намінацыі "Сямейныя традыцыі" | 1 – Д3 (раён) |
| 4. | Рэспубліканскі конкурс "Камп'ютар. Адукацыя. Інтэрнэт." у намінацыі "Электронны навучальны модуль для II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі" (урок-прэзентацыя для 7 класа па тэме "Шчыльнасць рэчыва") | Удзел у абласным этапе |
| 5. | Адкрыты Кубак Слуцкага раёна па спартыўным арыентаванні «Слуцкая восень» | 1 – Д3 (раён) |
| 6. | Адкрыты Кубак Слуцкага раёна па спартыўным арыентаванні "Слуцкая восень" | 1 – Д3 (раён) |

| | | |
|---|---|---|
| 7. | Раённы конкурс “Калядная зорка” ў намінацыі “Навагодняя галінка” з працай “Навагодняя казка” | 1-Д3 (раён) |
| 8. | Раённы конкурс “Калядная зорка” з працай “У казачным лесе” | 1-Д2 (раён) |
| 9. | Абласны этап рэспубліканскага конкурсу “Ідзі за марай” у намінацыі “Сувенір” | 1-Д3 (вобласць) |
| 10. | Абласны этап рэспубліканскага конкурсу “Ідзі за марай” ў намінацыі “Мастацкая фатаграфія” | 1 – Д3 (вобласць) |
| 11. | Адкрыты Кубак Слуцкага раёна па спартыўным арыентаванні (двухэтапная эстафета) | 1 – Д1 (раён) |
| 12. | Рэспубліканскі конкурс фотаработ “Мой край родны” з працай “Дом маіх продкаў” | 1-Д3 (вобласць) |
| 13. | Рэспубліканскі конкурс музеяў устаноў адукацыі “Во славу агульнай Перамогі” ў намінацыі “Інавацыйныя формы арганізацыі вучэбна-даследчай дзейнасці навучэнцаў” | 1 – Д1 (раён) |
| 14. | Рэспубліканскі конкурс музеяў устаноў адукацыі “Во славу агульнай Перамогі” ў намінацыі “Апісанне формаў і метадаў дзейнасці школы па ўвекавечанні імёнаў ахвяр і ўдзельнікаў ВАВ” | 1 – Д1 (раён) 1-Д2 (Рэспубліка) |
| 15. | Раённы этап рэспубліканскага конкурсу “Маёй зямлі вянкі сплятаю” з працай “Краявіды Мірскага замка” | 1-Д2 (раён) |
| 16. | Удзельнік абласных краязнаўчых чытанняў педагогаў «Мае славутыя землякі» ў рамках рэспубліканскай акцыі навучэнскай моладзі «Я гэты край Радзімаю заву» з працай «Дзве сястры-случчанкі – дзве зоркі на беларускім паэтычным небасхіле» | (атрымала пасведчанне ўдзельніка ў МАІРА) |
| 17. | Абласны (заключны) этап конкурсу работ даследчык-скага характару ў секцыі «Руская мова і літаратура» на базе МАІРА | 2 падсвед-чанні ўдзельнікаў (вобласць) |
| 18. | Абласны конкурс на лепшую сувенірную працу сярод педагогаў, намінацыя “Цестапластыка” “Куток маёй душы” | 1-Д1 (раён) 1-Д3 (вобласць) |
| 19. | Конкурс на лепшую сувенірную працу сярод педагогаў у намінацыі “Мастацкая вышыўка, пано”, пано “Карзіна летніх водараў” | 1-Д3 (раён) |
| 20. | Раённы конкурс “Кітай вачыма дзяцей” з маляўнічай работай “Храм у Паднябеснай” | 1-Д3 (раён) |
| 21. | Раённыя спаборніцтвы па спартыўным арыентаванні “Мандарынавы спрынт” | 1-Д2 (раён) |
| 22. | Раённы фестываль малодшых школьнікаў “Я-даследчык” з работай (секцыя гуманітарных ведаў) “Як агняборцам стаць, каб ад пажараў свет ратаваць!” Салавей Наталля Генадзьеўна, настаўнік пачатковых класаў | 1-Д1 (раён) 1 – падсвед-чанне (вобласць) |
| 23. | Раённы этап абласнога агляду-конкурсу дзіцячай творчасці “Дзеці. Вада. Бяспека” у намінацыі “Крыжаванка, рэбус” | 1 – Д2 (раён) |
| 24. | Раённы этап рэспубліканскага інтэрнэт-конкурсу літаратурных работ “Зямля пад белымі крыламі”, прысвечанага 90-годдзю У. Караткевіча ў рамках Года малой радзімы ў намінацыі “Лепшы вершаваны твор” | 1-Д1 1-Д3 (раён) |
| 25. | Раённы этап Рэспубліканскага інтэрнэт-конкурсу літаратурных работ “Зямля пад белымі крыламі”, прысвечанага 90-годдзю У. Караткевіча ў рамках Года малой радзімы ў намінацыі “Лепшы празаічны твор” | 1 – Д3 (раён) |
| 26. | Раённы конкурс «Выратавальнікі вачыма дзяцей» у намінацыі | 1-Д1 |

| | | |
|---|---|---|
| | «Верш» з работай «Мара» | (раён) |
| 27. | Раённы этап абласнога конкурсу “Школа бяспекі-2020” | 1-Д2 (раён) |
| 28. | Раённы тур абласнога этапу Рэспубліканскай выставы-конкурсу «Салют Перамогі-75» у намінацыі «Мастацкая фатаграфія» з работай «Вайна.Перамога.Памяць.» | 1 – Д3 (раён) |
| 29. | Конкурс метадычных распрацовак па правядзенню шостага школьнага дня | 1 – Д1 (раён) |

## 2020/2021 навучальны год

У 2020/2021 навучальным годзе вучні дзяржаўнай установы адукацыі ”Сяражская сярэдняя школа“ прынялі ўдзел ў дыстанцыйнай алімпіядзе па матэматыцы (5 клас – 51%, 7 клас – 63%), інтэрнэт-алімпіядзе па геаграфіі, рускай мове (8 клас – 100% - Д-1, 9 клас – 63%), беларускай мове (7 клас – 70%, 8 клас – 52%) (2019/2020 навучальны год – па геаграфіі, матэматыцы, рускай мове, англіскай мове, беларускай мове, грамадазнаўству).

У дзяржаўнай установе адукацыі ”Сяражская сярэдняя школа“ вядзецца актыўная работа па грамадзянска-патрыятычным выхаванні. Вучаніцы 9 класа Кастрыца Дар'я Васільеўна і Кудзіярава Анастасія Дзмітрыеўна пад кіраўніцтвам настаўніка рускай мовы і літаратуры Буканавай Т.М. у кастрычніку-лістападзе 2020 года прынялі ўдзел у абласным этапе рэспубліканскага конкурсу «Войны священные страницы навеки в памяти людской» у рамках рэспубліканскай героіка-патрыятычнай акцыі «Великой Победе – 75!» у намінацыях:

– ”Педагогі – удзельнікі ВАВ“ з даследчай работай”Крутыя павароты гісторыі ў жыцці і лёсе Новіка Аляксея Андрэевіча“ (работа была адзначана дыпломам I ступені на абласным узроўні; на заключным этапе (рэспубліка) дадзеная работа была агучана і абаронена на канферэнцыі на базе МАІРА ў анлайн-рэжыме, таксама атрымала дыплом III ступені на рэспубліканскім узроўні);

– ”Іх імёнамі названы…“ з работай «Невоспетые герои Слуцкого подполья» (работа была адзначана дыпломам II ступені на абласным узроўні).

Таксама пад кіраўніцтвам настаўніка рускай мовы і літаратуры Буканавай Т.М. навучэнка 9 класа Кудзіярава Анастасія ў красавіку 2021 года прыняла ўдзел у рэспубліканскім конкурсе эсэ ”Жывая памяць удзячных пакаленняў“ (гэта эсэ ўвайшло ў выпуск самага вялікага Калекцыйнага выдання эсэ навучэнцаў ”Жывая памяць удзячных пакаленняў“ у серыі «Великая Отечественная война в семейной истории», дадзены конкурс быў арганізаваны Дабрачынным фондам імя Аляксея Талая, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі

Беларусь, Мемарыяльным комплексам ”Брэсцкая крэпасць-герой“ сумесна з партнёрамі ў рамках нацыянальнай акцыі ”Дзеці незалежнай Беларусі ветэранам і будучым пакаленням! “).

Вучаніца 9 класа Кудзіярава Анастасія пад кіраўніцтвам настаўніка рускай мовы і літаратуры Буканавай Т.М. 27 красавіка 2021 года прыняла ўдзел у 72-й навукова-тэхнічнай канферэнцыі навучэнцаў, студэнтаў і магістрантаў БДТУ ”Першы крок у навуку“ з працай ”Пруская галіна Радзівілаў: ад заняпаду да былой велічы“, атрымала сертыфікат пераможцы рэспубліканскага ўзроўню. 24 мая 2021 года Кудзіярава Анастасія пад кіраўніцтвам настаўніка рускай мовы і літаратуры Буканавай Т.М. таксама прыняла ўдзел у раённым этапе рэспубліканскай патрыятычнай акцыі ”Іх подзвіг у памяці нашчадкаў захаваем“ у намінацыі ”Пошук. Знаходкі. Адкрыцці“ па тэме ”Партызанскімі сцежкамі“ з даследчай працай ”Людзі асобага складу“, атрымала дыплом I ступені (раён) і працягнула ўдзел у абласным этапе. 31 мая 2021 года стала вядома, што гэта работа атрымала дыплом II ступені на абласным узроўні і адабрана для ўдзелу ў рэспубліканскай канферэнцыі (рэспубліканскі ўзровень), якая адбылася 21 чэрвеня 2021 года на базе УА ”Рэспубліканскі цэнтр экалогіі і краязнаўства“ ў анлайн-рэжыме і атрымала дыплом III ступені (рэспубліка).

У 2020/2021 навучальным годзе былі паказаны наступныя вынікі:

| № п/п | Назва конкурсу | Узнагарода |
|---|---|---|
| 30. | Раённы этап рэспубліканскага конкурсу ”Патриот.by“ з работай у намінацыі ”Прэзентацыя“ | 1 – Д2 (раён) удзел у абласным этапе |
| 31. | Абласны этап рэспубліканскага конкурсу ”Войны священные страницы навеки в памяти людской“ у рамках рэспубліканскай героіка-патрыятычнай акцыі ”Вялікай Перамозе - 75!“ у намінацыях:<br>– ”Педагогі – удзельнікі ВАВ“ з працай ”Стромкія павароты гісторыі ў жыцці і лёсе Новіка Аляксея Андрэевіча“;<br>– ”Іх імёнамі названы...“ з працай ”Незаўважаныя героі Слуцкага збройнага падполля“. | 1 – Д1 (вобласць)<br>1 – Д3 (рэспубліка)<br>1 – Д2 (вобласць) |
| 32. | Раённая экалагічная фотаакцыя ”Знаёмцеся, гэта мой грызун!“ | удзел (раён) |
| 33. | Раённы тур абласнога этапу рэспубліканскай выставы-конкурсу ДПТ ”Калядная зорка“ у намінацыі ”сувенір-падарунак“ з работай ”Калядны анёл“ | 1-Д2 (раён) |
| 34. | Раённы экалагічны творчы конкурс ”Лепшы сябар“ з работай ”Сабака Шарык з Прастаквашына“ | 1-Д2 (раён) |
| 35. | Раённы тур абласнога этапу рэспубліканскай выставы-конкурсу ”Лёд. Кветкі. Фантазія“ у намінацыі ”фларыстычны калаж“ з | 1-Д3 (раён) |

| | | |
|---|---|---|
| | работамі ”знакі задыяку“ ”Дзева“, ”Рыбы“, ”Леў“ | |
| 36. | Раённы этап рэспубліканскага конкурсу ”Выратавальнікі вачыма дзяцей“ у намінацыі ”выраб“ з працамі:<br>– ”Буду пажарным“;<br>– ”На лёд не выходзь – бяду папярэдзь!“ | 1-Д1 (раён)<br>1-Д2 (раён) |
| 37. | Раённы этап рэспубліканскага конкурсу ”Выратавальнікі вачыма дзяцей“ у намінацыі ”верш“ з працай ”Важны ўрок“ | 1-Д2 (раён) |
| 38. | Раённы этап рэспубліканскага конкурсу ”Выратавальнікі вачыма дзяцей“ у намінацыі ”верш“ з працай ”Мае героі“ | 1-Д1 (раён) |
| 39. | Усерасійскі конкурс даследчых работ сярод навучэнцаў 1-11 класаў у намінацыі ”даследчая праца: навакольны свет“ з працай ”Як огнеборцем стаць, каб ад пажараў свет ратаваць?“ | 1-Д1 (міжнародн.) |
| 40. | Раённая выстава ДПТ і выяўленчага мастацтва ”Я і навакольны свет“ з працай ”інсталяцыя“ ”Мара рыбака“ | ўдзел (раён) |
| 41. | Раённы конкурс замяшчаючых бацькоў ”Сэрца аддаю дзецям“ з фотаработай ”Родныя прасторы“ | удзел (раён) |
| 42. | 50-ы Міжнародны маладзёжны конкурс твораў эпісталярнага жанру на тэму ”Напішы ліст члену сям'і аб сваім вопыце ў дачыненні да пандэміі COVID-19“ (ліст бабулі) | 1-Д3 (раён) |
| 43. | Раённы конкурс ДПТ ”Рукавіца узорная“ з працай ”Рукавіца - каб цяплу захоўвацца“ | 1-Д3 (раён) |
| 44. | Раённы тур абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу экалагічных фотаздымкаў і малюнкаў ”Ствараючы, не разбурай“ у намінацыі ”Подых прыроды“:<br>– ”Тварам да твару з прыродай“;<br>– ”Апошні крык свабоды ад прыроды“;<br>– ”Смная казка з добрым канцом“ | 1-Д1 (раён)<br>1-Д2 (вобласць)<br>удзел (раён)<br>удзел (раён) |
| 45. | Раённы тур абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу экалагічных фотаздымкаў і малюнкаў ”Ствараючы, не разбурай“ у намінацыі ”Подых прыроды“ з работай ”Разбураючы прыроду, губляеш сябе“ | удзел (раён) |
| 46. | Раённы тур абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу экалагічных фотаздымкаў і малюнкаў ”Ствараючы, не разбурай“ у намінацыі ”Прыгажосць вакол нас“:<br>– ”«Сказочный мир воды речки «Случь“;<br>– ”Лучик солнца золотой“ | удзел (раён)<br>удзел (раён) |
| 47. | Анлайн-флэшмоб раённай акцыі ”Маё сонейка-табе!“ (відэаролік) | падзяка (раён) |
| 48. | Рэспубліканскі конкурс эсэ ”Жывая памяць удзячных пакаленняў“ (дадзенае эсэ ўвойдзе ў выпуск самага вялікага калекцыйнага выдання эсэ навучэнцаў ”Жывая памяць удзячных пакаленняў“ у серыі ”Вялікая Айчынная вайна ў сямейнай гісторыі“ | публікацыя |
| 49. | 72-ая навукова-тэхнічная канферэнцыя навучэнцаў, студэнтаў і магістрантаў БДТУ ”Першы крок у навуку“ з працай ”Пруская галіна Радзівілаў: ад заняпаду да былой велічы“ (даследчая | сертыфікат пераможцы (рэспубліка) |

| | | |
|---|---|---|
| | праца) | |
| 50. | Раённы этап рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытачоў ”Жывая класіка“ з працай ”Кот Нелавимышь“ | 1-Д3 (раён) |
| 51. | Рэспубліканская патрыятычная акцыя ”Іх подзвіг у памяці нашчадкаў захаваем“ у намінацыі ”Пошук. Знаходка. Адкрыццё“ па тэме ”Партызанскімі сцежкамі“ з даследчай работай ”Людзі асаблівага складу“<br>Таццяна Мікалаеўна Буканава, настаўніца рускай мовы і літаратуры | 1-Д1 (раён)<br>1-Д2 (вобласць)<br>удзел у онлайн-канферэнцыі (1-Д3 рэспубліка) |

